КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 8 (1551)
19 ЛЮТАГА 2022 г.

Фота Пётры ВАСІЛЕЎСКАГА

Можна і датэрмінова!

Наступны тыдзень будзе вельмі значны, нават лёсавызначальны для ўсіх грамадзян краіны. Ужо цяпер праз паштовыя скрыні выбаршчыкі пачалі атрымліваць запрашэнні прыняць удзел у рэспубліканскім рэферэндуме, які адбудзецца 27 лютага.

Але ж, калі ў дзень рэферэндуму не будзе магчымасці прыйсці на ўчастак для галасавання, грамадзяне маюць права прагаласаваць датэрмінова з 22 да 26 лютага.

Ёсць час, каб прыйсці і аддаць свой голас за будучыню краіны!

Працяг тэмы — **на старонках 2, 3.**

Актуальна

"РЭФЕРЭНДУМ ВЫЗНАЧЫЦЬ БУДУЧЫНЮ БЕЛАРУСІ І КОЖНАГА З НАС"

З нагоды маючай адбыцца лёсавызначальнай падзеі "К" узяла інтэрв'ю ў міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча

ст. 2-3

Векапомнае

ГЛЯДЗЕЦЬ І ПАМЯТАЦЬ НЕСУПЫННА

Рэжысёр-дакументаліст Леанід Сітнікаў працуе над сумесным беларуска-расійскім праектам, прысвечаным драматычным акалічнасцям стварэння кінашэдэўра Элема Клімава "Ідзі і глядзі"...

ст. 6

Погляд з XXI стагоддзя

РАНЫ НА СЭРЦЫ, ШТО НЕ ЗАГОЙВАЮЦЦА НІКОЛІ...

...Паранены Міхаіл Савіцкі трапіў у палон — прабыў два гады і дзевяць месяцаў у фашысцкіх лагерах смерці. І — насуперак усяму — выжыў! Мабыць, Бог яго захаваў. Захаваў для краіны, для мастацтва, для свету, для нас, яго нашчадкаў...

ст. 14-15

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

9 771994 478007 22008

РЕСПУБЛИКАНСКИЙ РЕФЕРЕНДУМ 2022

27 лютага адбудзецца рэспубліканскі рэферэндум па пытанні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Падзея гэтая вельмі важная, насамрэч — лёсавызначальная, бо яна акрэсліць актуальны кантэкст у жыцці грамадства, у тым ліку і ў культурнай сферы, на шмат гадоў наперад. Напярэдадні рэферэндуму мы папрасілі адказаць на некалькі пытанняў, якія тычацца маючай адбыцца падзеі, міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча.

Анатолій Маркевіч: “Рэферэндум вызначыць будучыню Беларусі і кожнага з нас”

— Напрыканцы снежня на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале быў апублікаваны праект змен і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь для ўсенароднага абмеркавання. Наколькі актыўна яно адбывалася ва ўстановах культуры?

— Нават па той інфармацыі, якая публікавалася ў апошні месяц на старонках газеты “Культура”, можна меркаваць, наколькі шырокім і актыўным было гэтае абмеркаванне. Дыскусійныя пляцоўкі і сустрэчы рознага фармату прайшлі не раўнуючы ў кожнай установе сферы культуры, выклікаўшы шчырую зацікаўленасць калектываў. Дарэчы, такія абмеркаванні адбыліся і ў вашай рэдакцыйна-выдавецкай установе.

Людзі разумеюць, што абноўленая Канстытуцыя — падзея гістарычнага маштабу, і менавіта на рэферэндуме будзе закладзена заканадаўчая аснова нашага далейшага жыцця на дзесяцігоддзі. А паколькі работнікі культуры, як і наогул творчая інтэлігенцыя, — гэта людзі з актыўнай сацыяльнай пазіцыяй, да плебісцыту яны паставіліся вельмі ўдумліва і адказна.

— Відавочна, што праект Асноўнага Закона ўбірае ў сябе ўсе апошнія напрацоўкі, вопыт Беларусі за яе суверэнны перыяд, у тым ліку і ў сацыякультурнай сферы. У сувязі з гэтым, Анатолій Мечыслававіч, не маглі б вы коратка закрануць усе тыя заканадаўчыя перадумовы, што закладвалі падмурак, на якім у апошнія дзесяцігоддзі развівалася наша культура?

— Найперш тут, вядома, варта адзначыць Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры — унікальны збор заканадаўчых актаў, які не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. З лютага споўнілася ўжо пяць гадоў з таго моманту, як ён уступіў у сілу. Практыка паказала, што, наколькі б дасканалым ні быў той ці іншы нарматыўны дакумент, з часам усё адно ён запатрабуе пэўнай карэкціроўкі — яе вымагае само жыццё.

Таму ў мінулым годзе мы завяршылі працу над законапраектам, які прадугледжвае ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс аб культуры. Такія змены рознай ступені значнасці закрануць 109 са 257 яго артыкулаў. Спектр — даволі шырокі: гэта і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, і правядзенне культурных мерапрыемстваў, і бібліятэчная справа... Усе інавацыі ўнесеныя выключна на аснове аналізу практыкі прымянення Кодэксу і тых прапаноў, якія паступалі ад самых розных суб’ектаў культурнага працэсу — упраўленняў культуры, асобных устаноў, творчых саюзаў... Спадзяемся, закон уступіць у сілу з наступнага, 2023 года, каб работнікі культуры на месцах мелі пэўны час на адаптацыю да новаўводзінаў.

— З моманту свайго ўступлення на пасаду міністра культуры вы ўзялі за правіла актыўна ездзіць па рэгіёнах краіны, праводзіць шматлікія сустрэчы з людзьмі, прамыя тэлефонныя лініі. Скажыце, калі ласка, якія пытанні ў апошні час вам задавалі нашы грамадзяне?

— І сапраўды, не толькі я, але і ўсе работнікі цэнтральнага апарата Міністэрства культуры сталі куды часцей выязджаць у рэгіёны, а таксама выкарыстоўваць сучасныя спосабы камунікацыі, уключна з сацыяльнымі сеткамі. Для нас вельмі важна пачуць голас кожнага работніка галіны: яго ідэі, прапановы, хваляванні... Лічу, менавіта на падставе такіх непасрэдных чалавечых зносін можна прымаць тыя ўзважаныя рашэнні, якія максімальна ўлічваюць інтарэсы кожнага.

Пытанні, якія даводзіцца чуць, могуць тычыцца як спраў глабальных — скажам, новага праекта Канстытуцыі або правядзення рэспубліканскіх акцый, — так і вельмі канкрэтных праблемных момантаў, датычных юрыдычнага аспекту дзейнасці той ці іншай установы. І на кожнае з гэтых пытанняў мы імкнемся даць адказ!

— Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сёлета 1 студзеня падпісаў Указ № 1 “Аб аб’яўленні 2022 года Годам гістарычнай памяці”. Наша газета ў сваіх публікацыях заўсёды надавала падвышаную ўвагу тэме айчыннай гісторыі. Ці не маглі б вы нагадаць нашым чытачам, якія практычныя крокі ў апошнія гады рабіла беларуская дзяржава для таго, каб захаваць памяць народа ў мемарыялах і помніках?

— Важнасць гэтай тэмы і прынятага рашэння засноўваецца на тым, што мір і стабільнасць дзяржавы шмат у чым фарміруюцца памяццю народа і яго культурай як асновай самаідэнтыфікацыі. Папярэдні, 2021 год, абвешчаны Годам народнага адзінства, быў адзначаны цэлым шэрагам мерапрыемстваў і праектаў, скіраваных на ўшанаванне памяці аб падзеях міжваеннага перыяду ў Заходняй Беларусі і яе далучэння да БССР у 1939 годзе. 17 верасня ў краіне ўпершыню прайшло адзначэнне Дня народнага адзінства. Адбылося ўрачыстае адкрыццё абноўленага мемарыяла на месцы канцэнтрацыйнага лагера ў Бярозе Брэсцкай вобласці, які дзейнічаў у 1934-1939 гадах, і прысвечанай яму музейнай экспазіцыі ў колішнім лагерным корпусе. Сёлета, у рамках адзначэння Года гістарычнай памяці, будзе нададзеная ўвага і іншым перыядам гісторыі нашага народа.

У Стоўбцах...

> *Далучэнне грамадзян да гераічнай гісторыі і нацыянальных традыцый дапамагае кожнаму ўсвядоміць адказнасць за захаванне набыткаў мінулага і вызначэнне будучыні краіны.*

Вялікія намаганні прыкладаюцца для захавання гісторыка-архітэктурных помнікаў. Працягваліся і рэстаўрацыйныя работы на шэрагу найвыбітнейшых аб’ектаў архітэктурнай спадчыны ў самых розных кутках краіны. У Гальшанах, што ў Ашмянскім раёне, завершаная першая чарга кансервацыі з рэстаўрацыяй у славутым замку Сапегаў XVI стагоддзя. Працягваюцца работы і на замку XIV стагоддзя ў Крэве Смаргонскага раёна і Старым замку ў Гродна, дзе напрыканцы мінулага года была адкрытая музейная экспазіцыя. Працягваецца аднаўленне неагатычнага палаца Пуслоўскіх у Косаве Івацэвіцкага раёна, палаца Булгакаў XVIII стагоддзя ў Жылічах, што ў Кіраўскім раёне, палаца Сапегаў у Ружанах Пружанскага раёна, вядуцца рэстаўрацыйныя работы ў Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку. Зробленыя першыя крокі па аднаўленні касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Будславе пасля наступстваў пажару, які здарыўся ў маі мінулага года.

— "Праяўленне патрыятызму, захаванне гістарычнай памяці пра гераічнае мінулае беларускага народа з’яўляецца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь" . Якім чынам культура, на ваш погляд, павінна садзейнічаць навядзенню мастоў гістарычнай пераемнасці між пакаленнямі, цэментаваць беларускае грамадства?

— Гэтае дапаўненне ў 54-ы артыкул абноўленай Канстытуцыі, відавочна, накіраванае на ўмацаванне мастоў пераемнасці паміж пакаленнямі. Без малога 77 гадоў аддзяляюць Беларусь ад самай страшнай і крывавай вайны — вайны, якая прынесла нашай краіне не толькі незлічоныя беды і пакуты, але і прадэманстравала веліч і сілу духу беларускага народа. Тым не менш усё далей у мінулае адыходзіць страшная і гераічная рэальнасць Вялікай Айчыннай, усё часцей ёй на змену прыходзіць прывідная рэальнасць, якая нясе з сабой не менш сур’ёзныя разбуральныя пагрозы для грамадства. Таму пытанні патрыятычнага выхавання маюць ключавое значэнне для нашай краіны. У сувязі з гэтым у праект абноўленай Канстытуцыі (у артыкул 15-ы) унесеныя важкія дапаўненні, звязаныя з захаваннем гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Памяць пра вайну і акупацыю ў нашай краіне і сёння яшчэ блізкая і балючая для многіх сем’яў, непасрэдна закранутых ліхалеццем. Амаль кожны з нас мае сярод сваіх продкаў і сваякоў герояў і ахвяр той вайны. 2019 і 2020 гады прайшлі пад знакам святкавання 75-годдзяў, адпаведна, вызвалення Беларусі і перамогі над нацызмам. У 2021 годзе маштабна адзначалася 80-годдзе з дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Беларускі досвед гэтай вайны застаецца ўнікальным, і айчынныя навукоўцы ды дзеячы культуры яскрава імкнуцца данесці свету свой прынцыповы і адметны погляд на гісторыю тых незабыўных гадоў, трактуючы фактаалогію з беларускіх пазіцый.

Тэме захавання памяці пра герояў і ахвяр вайны прысвечаныя шматлікія навуковыя канферэнцыі, музейныя выставы і выдавецкія праекты. Захоўваецца памяць і пра мясціны, непасрэдна звязаныя з трагедыяй вайны, — абноўлены мемарыяльны комплекс памяці спаленых вёсак у Борках Кіраўскага раёна на Магілёўшчыне, узведзены мемарыял на месцы вёскі Ала Светлагорскага раёна Гоме-

льскай вобласці, знішчанай разам з жыхарамі ў 1944 годзе, прынятае рашэнне аб абнаўленні мемарыяла на месцы масавага знішчэння ахвяр нацызму на Броннай Гары ў Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобласці.

— Сям'я, заснаваная на традыцыйных каштоўнасцях, вядома ж, павінна рыхтаваць новыя пакаленні да грамадска карыснай працы, прышчапляць культуру і павагу да законаў, гістарычных і нацыянальных традыцый Беларусі. Ці магла б тут больш актыўную ролю адыграць менавіта культурная сфера?

— Далучэнне грамадзян да

У Лідзе...

гераічнай гісторыі і нацыянальных традыцый дапамагае кожнаму ўсвядоміць адказнасць за захаванне набыткаў мінулага і вызначэнне будучыні краіны. Варта падкрэсліць значнасць культуры як асновы для стваральнай працы і складніка, які аб'ядноўвае людзей розных узростаў і поглядаў. Спадчына яднае ўсіх нас. І кожны работнік сферы робіць вялікі ўклад у тое, каб дасягненні, якімі ганарыцца наша дзяржава, маглі быць прадстаўлены жыхарам краіны. Менавіта ў нацыянальнай культуры і гістарычнай памяці сабраны духоўныя каштоўнасці. У сучасным свеце культура павінна быць фундаментам патрыятызму, з якога і вынікае памкненне працаваць дзеля развіцця краіны, дзеля агульнай карысці. Як неаднойчы адзначаў Кіраўнік дзяржавы, без арыентацыі на высокую культуру мы не можам выхаваць грамадзяніна-патрыёта, руплівага працаўніка, асобу творчую і духоўна багатую. Таму на работніках сферы культуры, безумоўна, ляжыць вялікая адказнасць.

— Падчас выніковай калегіі Міністэрства культуры, што адбылася нядаўна ў сталіцы, між іншых важных пытанняў было згадана аб неабходнасці заахвочвання творчай моладзі да ўдзелу ў культурным жыцці краіны. Якія крокі неабходна зрабіць у гэтым напрамку?

— Пытанне выяўлення творчай моладзі і стварэння спрыяльных умоў для развіцця яе талентаў знаходзіцца на асаблівым кантролі Адміністрацыі Прэзідэнта, гэта даручэнне Кіраўніка дзяржавы. Неабходна забяспечыць суправаджэнне таленавітай моладзі на ўсіх этапах творчага шляху, фарміраванне яе светапогляду і грамадзянскасці. Праца з дзецьмі і моладдзю павінна забяспечыць выхаванне патрыётаў сваёй краіны, адказных людзей з канструктыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Больш уважлівага і неабыякавага стаўлення патрабуе арганізацыя работы па вылучэнні таленавітай моладзі на заахвочванні спецыяльнага фонду Прэзідэнта. Па выніках калегіі пастаўлены задачы прыцягваць да правядзення дзяржаўных спецыяльных мерапрыемстваў маладых рэжысёраў і прадстаўнікоў таленавітай моладзі — пераможцаў міжнародных, нацыянальных і рэгіянальных конкурсаў і фестываляў. У мэтах прыцягнення таленавітай моладзі да вытворчасці фільмаў мяркуецца абвясціць конкурс кінапраектаў сярод маладых кінематаграфістаў з правядзеннем па яго выніках маладзёжнага кінафестывалю.

— Ужо хутка абноўлены варыянт Асноўнага Закона ўвойдзе ў паўсядзённае жыццё. Новая Канстытуцыя прадугледжвае і новы этап развіцця Беларусі. Як сказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, у краіне будзе нанава адбудавана ўся сістэма ўлады. Як вы лічыце, якую будучыню мы пабудуем разам? Ці здолеем захаваць нацыянальную самабытнасць, суверэнітэт у поўнай меры, культурныя і духоўныя традыцыі нашага народа?

— Па-ранейшаму асновай дзяржаўнай палітыкі застаецца мэта захавання і ўзмацнення суверэнітэту, забеспячэння правоў і свабод грамадзян. Нязменным прыярытэтам з'яўляецца сацыяльная скіраванасць. Пры гэтым у абноўленай Канстытуцыі вызначана мера адказнасці грамадзян. Чалавек павінен разумець, што мае не толькі правы, але і абавязкі. Узаемная адказнасць дзяржавы і грамадзян прасочваецца ў многіх артыкулах, у тым ліку ў тых, якія тычацца праяўлення патрыятызму, сацыяльных паводзін, захавання здароўя. Наша будучыня залежыць ад намаганняў кожнага члена грамадства. І, вядома, адным з краевугольных камянёў, на якіх трымаецца беларуская дзяржава, з'яўляецца нацыянальная культура. Упэўнены, мы зможам захаваць найлепшыя дасягненні папярэднікаў і ўзбагаціць гэты скарб.

Пытанні задаваў
Аляксандр КРЫВАНОС

РЕСПУБЛИКАНСКИЙ РЕФЕРЕНДУМ 2022

Каб выхаваць патрыёта

Праект змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі, па якім ужо на наступным тыдні ў краіне адбудзецца галасаванне, сапраўды выклікаў шчырую зацікаўленасць беларускага грамадства.

Па-за ўвагай прадстаўнікоў культуры не засталіся палажэнні, звязаныя з выхаваннем патрыятызму.

Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" Ларыса Бібік:

— Працэс падрыхтоўкі абноўленай Канстытуцыі, які ішоў на працягу не аднаго месяца, нікога не пакінуў абыякавым. І людзі, звязаныя з захаваннем гістарычнай спадчыны, зацікаўлены ў ім як ніхто іншы. Наш калектыў распрацаваў свае прапановы, і было радасна пабачыць іх у праекце на выніковым этапе. Мы можам падпісацца пад кожным словам у палажэннях, якія тычацца захавання памяці і супрацьдзеяння фальсіфікацыі гісторыі. Трэба фарміраваць паважлівае стаўленне да мінулага яшчэ ў сям'і. Мы бачым, з якой зацікаўленасцю дзеці глядзяць на рэлікві ў нашых экспазіцыях, з якой ахвотай наведваюць мерапрыемствы і сочаць за рэканструкцыямі гістарычных падзей у мемарыяльным комплексе. Так з дзяцінства фарміруецца грамадзянін, здольны абараніць краіну ў той момант, калі нехта замахваецца на яе каштоўнасці. І выхаванне такой асобы — агульная справа.

Намеснік дырэктара Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Вольга Палітыка:

— У нашай установе актыўна абмяркоўваўся праект змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі. Асаблівую ўвагу вызваў артыкул 15, які дапоўнены такім палажэннем: "Дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці пра гераічны подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны". Падчас дыялогавых пляцовак многія навучэнцы выказаліся ў падтрымку дадзенага дапаўнення і запэўнілі ў гатоўнасці далучыцца да працы ў гэтым кірунку.

Вялікую цікавасць заўсёды выклікае наведванне знакавых мемарыяльных аб'ектаў і музеяў. Нашы навучэнцы таксама ўдзельнічаюць у патрыятычных акцыях, святочных канцэртах да Дня Перамогі, Дня Незалежнасці і іншых важных дат. У рамках рэспубліканскага культурна-патрыятычнага кінамарафону "Глядзі і памятай", прысвечанага 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у інтэрнаце каледжа праходзілі прагляды фільмаў пра гэтыя старонкі нашай гісторыі. Да такіх форм працы варта звяртацца далей. І мы будзем упэўненыя, што наша моладзь у будучыні зможа абараняць нацыянальныя інтарэсы краіны, быць сапраўднымі патрыётамі.

Даніїл ШЭЙКА

Вялікі Савіцкі

Ігар Луцкі (у цэнтры), Анатолій Маркевіч, Канстанцін Шульган, Уладзімір Пракапцоў (злева).

18 лютага ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адбылося адкрыццё выставачнага праекта "Міхаіл Савіцкі. Да 100-годдзя з дня нараджэння". У прывітальным адрасе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, які падчас мерапрыемства зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, у прыватнасці, сказана: "Творчасць майстра стала новым словам у мастацтве і атрымала сусветнае прызнанне. Яго работы ўзбагацілі сучасную культуру і назаўжды ўвайшлі ў гісторыю незалежнай Беларусі.
Прайшоўшы праз агонь Вялікай Айчыннай вайны і жахі канцлагераў, Міхаіл Андрэевіч у сваіх творах адлюстраваў страшную праўду таго часу і пакінуў нам наказ — памятаць бяссмяротны подзвіг народа і прынесеныя дзеля шчаслівай будучыні ахвяры.
Сёння мы, грамадзяне суверэннай дзяржавы, шануем і зберагаем тое, у імя чаго тварыў наш вядомы зямляк".
На ўрачыстасці прысутнічалі таксама міністр культуры Анатолій Маркевіч і міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Так, сярод юбілейных мерапрыемстваў самым значным з'яўляцца вялікая выстава твораў Савіцкага ў Нацыянальным мастацкім музеі. Яна займае ўвесь першы паверх нашай скарбніцы. Чатыры залы — чатыры экспазіцыі, прысвечаныя розным іпастасям творцы. Разам жа яны ствараюць цэльны вобраз асобы мастака і часу, у якім яму давялося жыць і працаваць.

Першая зала — ранні Савіцкі. Той, у якога яшчэ наперадзе агульна прызнаны статус класіка, стваральніка беларускай версіі "суворага стылю", вынаходніцтва ўласнага, сёння ўсім вядомага почырку. Той Савіцкі, які яшчэ не напісаў "Партызанскай мадонны". Ранні Савіцкі — традыцыяналіст, безумоўна прафесіянал, нічым асаблівым не вылучаецца сярод беларускіх мастакоў 50-х — пачатку 60-х гадоў. Мабыць, гэты перыяд ягонай творчасці можна трактаваць як час пошукаў сваёй вобразна-пластычнай мовы.

Экспазіцыя другой залы — вобраз жанчыны ў творчасці мастака. Тут таго, хто ведае Міхаіла Савіцкага выключна як брутальнага, часам нават змрочнага рэаліста (а як інакш пра вайну ды пра Чарнобыль распавесці!?) ды яшчэ з гэткім ухілам у сімвалізм рэлігійнага характару, адкрыце для сябе нечаканую іпастась гэтага творцы. Ён, аказваецца, быў глыбока пачуццёвы лірык. Савіцкі ў сваіх карцінах сцвердзіў свой ідэал жаночай прыгажосці, чымсьці блізкі мадоннам Рэнесансу. Але тыпалагічна і сутнасна гэта беларускі ідэал. Сэнсавы і візуальны цэнтр гэтай экспазіцыі — "Партызанская мадонна Мінская".

Трэцяя зала — тэма вайны. Тут і карціна "Партызаны", ад якой, лічаць знаўцы, пачаўся "сапраўдны" Савіцкі, і "Віцебскія вароты", і "Пакаранне смерцю", і палатно з "Лічбаў на сэрцы". Тыя "Лічбы..." б'юць па нервах балюча, як кінафільм "Ідзі і глядзі". Глядзець той фільм двойчы не ў кожнага хопіць духу...

Апошняя зала — Чарнобыль. Некалькі карцін з таго самага славутага цыкла. Мяркую, і па сённяшні дзень ніхто з нашых творцаў не сказаў пра тую трагедыю больш важкага слова... Яшчэ ў экспазіцыі творы, дзе хрысціянскія матывы прысутнічаюць наўпрост ці ў сацыяльным кантэксце. Яны натуральна стасуюцца з чарнобыльскай тэмай, бо мы памятаем, што, як выбухнуў ядзерны рэактар, нават зацятыя атэісты ўспомнілі пра Зорку Палын.

Экспазіцыйныя залы першага паверха Нацыянальнага мастацкага спланаваныя такім чынам, што, агледзеўшы экспазіцыю, ідзеш назад — выходзіш тым жа шляхам, як і прыйшоў. Пасля жыццёвай храналогіі, атрымліваецца, ідзём на адваротны адлік. Чарнобыль — Вайна — Жанчыны — Маладосць. Прайшлі праз жыццё і вяртаемся да жыццядайных вытокаў. Дазволю сабе пафас: да жыццядайных вытокаў Быцця. І ведаеце, прыходзіш да думкі, што хоць і быў наш славуты творца насамрэч брутальным рэалістам, а маляваў усё жыццё нашу нацыянальную расліну — Папараць-кветку.

Па сутнасці вялікі мастак быў вялікім аптымістам.

Працяг тэмы — на старонках 14-15.

3 лютага ў міжнародным прэс-цэнтры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшоў навукова-практычны семінар у рамках рэспубліканскага праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця”, прысвечаны ўшанаванню памяці ўдзельнікаў літаратурнага аб’яднання “Маладняк” на іх малой радзіме і развіццю літаратурнага краязнаўства. Напярэдадні Дня роднай мовы, што адзначаецца 21 лютага, увага да ініцыятыў, пакліканых захаваць спадчыну літаратараў, якія стваралі новую літаратуру на беларускай мове, як ніколі актуальная.

Антон РУДАК

Сябры літаб’яднання “Маладняк”.

Нясцёртыя сляды матчынай мовы

Плынь жыцця “Маладняку” праз стагоддзе

Арганізацыя “Маладняк”, створаная ў 1923 годзе ў Мінску, была першым літаратурным аб’яднаннем Беларусі і адыграла вялікую ролю ў развіцці беларускай літаратуры. Менавіта ў яе шэрагах пачынаўся творчы шлях многіх выдатных літаратараў БССР міжваеннага перыяду, такіх як Уладзімір Дубоўка, Ян Скрыган, Пятрусь Броўка, Міхась Лынькоў, Пятро Глебка і многія іншыя.

Як зазначыў намеснік генеральнага дырэктара, дырэктар па навуковай рабоце, сацыякультурнай і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша, на працягу трох гадоў Нацыянальная бібліятэка Беларусі разам з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Выдавецкім домам “Звязда” ажыццяўляе маштабны рэспубліканскі праект “На хвалі часу, у плыні жыцця”, прымеркаваны да 100-годдзя Усебеларускага аб’яднання паэтаў і пісьменнікаў “Маладняк”, што будзе адзначацца ў наступным годзе.

КРЭЎНАЯ СУВЯЗЬ З КЛАСІКАМІ

Загадчык сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Таццяна Лаўрык распавяла аб дасягненнях праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця” за гады яго дзейнасці і планах на бліжэйшую будучыню. Праект рэалізуецца з 2019 года, за час яго існавання на сайце бібліятэкі па адрасе nlb.by былі створаныя дзевяць віртуальных раздзелаў, прысвечаных юбілеям маладнякоўцаў Валерыя Маракова, Адама Бабарэкі, Уладзіміра Хадыкі, Уладзіміра Дубоўкі, Кузьмы Чорнага, Яна Скрыгана, Андрэя Александровіча, Змітрака Бядулі і Міхася Зарэцкага. Цяпер быў прэзентаваны дзясяты раздзел, прысвечаны жыццю і творчасці Алеся Гурло, 130-годдзе з дня нараджэння якога адзначалася сёлета 31 снежня. Між іншага, на старонцы праекта кожны можа азнаёміцца з электроннымі копіямі пяці кніг гэтага аўтара.

Мемарыяльны кабінет Пятра Глебкі.

Экспазіцыя ў гісторыка-краязнаўчым музеі “Бацькаўшчына” ў а/г Камень Капыльскага раёна.

Пераход мерапрыемстваў праекта ў анлайн-фармат дазволіў, сярод іншага, наладзіць сувязь са сваякамі маладнякоўцаў — напрыклад, з Алегам Александровічам, унукам паэта Андрэя Александровіча, які перадаў бібліятэцы багата каштоўных матэрыялаў да біяграфіі свайго продка, яны папоўнілі адпаведны віртуальны раздзел праекта: да ўсяго гэта і алічбаваныя кніжныя выданні, якія адсутнічалі ў зборах Нацыянальнай бібліятэкі, фотаздымкі і рукапісы літаратара. У рамках леташніх мерапрыемстваў, прысвечаных 135-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі, было наладжанае плённае супрацоўніцтва з ягоным сынам Яфімам Плаўнікам, які таксама цягам апошняга года перадаваў бібліятэцы разнастайныя матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю свайго бацькі.

Ганаровым госцем і ўдзельнікам цяперашняга мерапрыемства, у сваю чаргу, зрабілася Галіна Скрыган — дачка пісьменніка-маладнякоўца Яна Скрыгана, якая распавяла аб выданні дзённікавых запісаў і ўспамінаў свайго бацькі, многія старонкі якіх прысвечаныя сведчанням аб жыцці і дзейнасці яго калег па пяру. Дыстанцыйным чынам паўдзельнічала ў мерапрыемстве і ўнучатая пляменніца пісьменніка Міколы Нікановіча — Яўгенія Дзяркач, якая ў сваім відэазвароце падзялілася асабістымі ўспамінамі і сямейнымі фотаздымкамі, у тым ліку і фота з малой радзімы літаратара ў вёсцы Кляннік Смалявіцкага раёна, дзе захаваліся яго родная хата, а таксама хата яго сваякоў, у якой бывалі ў гасцях Пятрусь Броўка, Максім Лужанін, Васіль Каваль, Тодар Кляшторны ды іншыя маладнякоўцы. Таксама Яўгенія Дзяркач звярнула ўвагу на тое, што пахаванне бацькоў літаратара на могілках яго роднай вёскі сёння патрабуе добраўпарадкавання і замены надмагілля, і звярнулася з заклікам аб дапамозе ў гэтай справе да людзей, неабыякавых да памяці сваяка.

Удзельнікі велапрабегу “Па мясцінах Дубоўкі”.

ПАДАРОЖЖА ДА КАЛЫСКІ

Тэму ўшанавання маладнякоўцаў на іх малой радзіме працягнулі супрацоўнікі культурных і адукацыйных устаноў з розных куткоў краіны. Бібліятэкар Пастаўскай дзіцячай бібліятэкі Людміла Сяменас распавяла аб ушанаванні памяці Уладзіміра Дубоўкі, імя якога гэтая ўстанова носіць з 2000 года. Сярод незвычайных форм дзейнасці ў гэтым напрамку — арганізацыя велапрабегу “Па мясцінах Дубоўкі”, які адбыўся ў 2020 годзе. Маршрут быў распрацаваны на аснове кнігі аўтабіяграфічных апавяданняў і ўспамінаў паэта “Пялёсткі”. Таксама быў зняты відэафільм “У песнях я на Беларусь малюся”, які распавядае аб жыцці і творчасці класіка.

Бібліятэкар аддзела маркетынгу Шклоўскай раённай бібліятэкі Таццяна Рэентовіч распавяла пра ініцыятывы, што ладзіць установа дзеля ўшанавання памяці свайго вядомага земляка Міхася Зарэцкага, 120-годдзе з дня нараджэння якога адсвяткавалі летась. Хаця празаік нарадзіўся ў Талачынскім раёне, але яго станаўленне як асобы і творцы непасрэдна звязанае са Шклоўшчынай. Тут, у вёсцы Зарэчча ля Шклова, прайшло яго дзяцінства, пасля таго як у тутэйшую царкву быў прызначаны служыць дзякам бацька будучага пісьменніка. Менавіта ад назвы вёскі ўзнік і сам літаратурны псеўданім Міхася Касянкова.

Дырэктар Каменскага вучэбна-педагагічнага комплексу ў Капыльскім раёне Галіна Васілевіч і кіраўніца створанага на базе школы гісторыка-краязнаўчага музея “Бацькаўшчына” Ірына Тагіль распавялі аб тым, як ушаноўваецца на малой радзіме памяць пра пісьменніка Яна Скрыгана. У згаданым музеі захоўваюцца не толькі дакументы, звязаныя з жыццём і творчасцю літаратара, але і яго асабістыя рэчы — самаробныя драўляныя кіёчкі, якімі ён карыстаўся, тканыя гальштукі, настольная лямпа, будзільнік, акуляры.

ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ ТВОРЦАЎ

Працягнулі расповед аб ушанаванні маладнякоўцаў калегі са сталічных бібліятэк і музеяў. Культуролаг аддзела маркетынгавых камунікацый Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Радзівон Колас прадставіў прэзентацыю сайта, створанага ў гэтай установе мемарыяльнага кабінета Пятра Глебкі, дзе сабраныя каштоўныя рукапісы, відэаэкскурсіі, успаміны пра пісьменніка аўтарства яго дачкі. Адметна, што ў бібліятэцы класіка, якая налічвае каля чатырох тысяч асобнікаў, можна пабачыць кнігі са збораў Адама Станкевіча і Клаўдыя Дуж-Душэўскага, з Віленскага беларускага музея. Разам з бібліятэкай тут можна знайсці асабістыя рэчы і дакументы з архіва паэта. На сайце можна атрымаць інфармацыю пра экспанаты, прадстаўленыя ў мемарыяльным кабінеце, а таксама пра бібліяграфію самога Пятра Глебкі і твораў, прысвечаных яго жыццю ды творчасці.

А загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Барановскі распавёў аб сувязі літаратурных пакаленняў на прыкладзе Змітрака Бядулі і Максіма Багдановіча. Як вядома, гасцюючы ў Мінску ў 1916 годзе, Максім Багдановіч даволі працяглы час жыў у адным доме са Змітраком Бядулем — цяпер тут месціцца філіял музея “Беларуская хатка” на вуліцы Рабкораўскай. Пасля трагічнага скону маладзейшага калегі Змітрок Бядуля першым прысвяціў багата ўвагі захаванню памяці аб Максіме Багдановічы, напісаўшы некралог і ўспаміны аб ім, а таксама ўпершыню апублікаваўшы ў друку ягоны фотаздымак. Пад уплывам расповедаў Змітрака Бядулі свае творы прысвячалі памяці Багдановіча і многія літаратары-маладнякоўцы. Ініцыятывы па захаванні і ўшанаванні памяці аб ранейшых пакаленнях творцаў і сёння спрыяюць не толькі непарыўнасці літаратурнай традыцыі, але і маюць вялікі патэнцыял для развіцця культурнага, адукацыйнага ды творчага жыцця вёсак і мястэчак, адкуль паходзяць класікі айчыннай літаратуры, дзе раслі ды сталелі як яны самі, так і іх таленты.

Ілюстрацыі з сайта nlb.by.

Зямля, багатая на таленты

Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж.

У кожным рэгіёне нашай краіны вядзецца пастаянная работа ўстаноў адукацыі сферы культуры, накіраваная на то, каб вучыць моладзь і развіваць яе таленты. Сёння я хачу распавесці пра Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж, які збірае перадусім таленавітых навучэнцаў з Віцебскай вобласці і дае ім прафесію, накіроўвае на вучобу ў найлепшыя ВНУ краіны. Цікавы факт, што ў гэтай установе працуюць два прызнаныя кампазітары, настаўнікі лаўрэатаў сусветных конкурсаў, пастаянна дзейнічаюць дзевяць творчых калектываў, сярод якіх два маюць званне народных. Лепш за ўсё расказаць пра каледж зможа яго дырэктар Наталля Молісава.

Павел САЛАЎЁЎ / Фота аўтара
Мінск — Наваполацк — Мінск

Наталля Іванаўна Молісава.

Міхаіл Іванавіч Івашкін.

"У нас сёння вучацца 157 студэнтаў па спецыяльнасцях "дырыжыраванне", "інструментальнае выканальніцтва" і "музыказнаўства", — распавядае дырэктар Наталля Іванаўна. — У кожнай спецыяльнасці ёсць спецыялізацыя. Напрыклад, у інструментальным выканальніцтве — фартэпіяна, струнна-смычковыя інструменты, інструменты народнага аркестра і аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты. Дырыжыраванне ў нас падзяляецца на кіраванне акадэмічным ці народным хорам. А спецыяльнасць "музыказнаўства" самастойная, дзе навучэнцы атрымліваюць пашыраныя веды па музыцы.

Да нас прыходзяць пасля 9 класаў, як правіла скончыўшы школу мастацтваў альбо якія-небудзь гурткі па класе музычнага інструмента. У сваю чаргу мы вучым нашых выпускнікоў высокай прафесіі артыста, робім усё для таго, каб яны сталі добрымі кіраўнікамі творчых калектываў, настаўнікамі музычных школ. Мы стараемся забяспечваць такімі спецыялістамі культурныя ўстановы Віцебскай вобласці. Для нас гэтае пытанне важнае, каб таленавітыя дзеці з нашага рэгіёна паступалі ў наш каледж, а потым вярталіся на месцы на сваёй малой радзіме і падрыхтоўвалі нам абітурыентаў. Гэтым ствараецца пераемнасць і ўзаемны дабрабыт.

Вучацца ў нас чатыры гады. А пасля падрыхтоўкі мы арыентуем выпускнікоў да паступлення ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі і БДУКМ. Прыкладна палова выпускнікоў каледжа ідуць туды. Ёсць і такія нашыя навучэнцы, якія працягваюць вучобу ў БДАМ, дзе аддаюць перавагу прафесіі гукарэжысёра, БДУ і нават у БДУФК. На першым курсе ў прыярытэце агульнаадукацыйныя дысцыпліны, пасля ўсё большы час надаецца спецыялізаваным прадметам. Як і ў іншых каледжах, тут ёсць спецыяльны для навучання інструмент і дадатковы. Адзначу, што спецыфіка адукацыі ў каледжы няпростая, тут навучэнцам трэба шмат займацца індывідуальна з выкладчыкамі, ад гэтага і навучанне ў каледжы каштуе даражэй. Але ў канчатковым выніку падрыхтоўваюцца высакакласныя музыканты.

Усе, хто мае патрэбу, у нас забяспечваюцца сучасным інтэрнатам з вельмі добрай матэрыяльна-тэхнічнай базай. У каледжы працуе цудоўны псіхолаг, які праводзіць мерапрыемствы па адаптацыі і прафарыентацыі навучэнцаў. Для першакурснікаў мы праводзім самыя розныя экскурсіі ў культурныя ўстановы. Таксама мы арандуем паслугі ФАЦ "Ізумрудны" каля каледжа, так што нашы навучэнцы могуць з карысцю для здароўя правесці час. Аднак у іх мала часу на забавы: шмат даводзіцца працаваць па выбраным спецыяльнасцям.

Паколькі Полаччына — калыска праваслаўя Беларусі, мы шмат супрацоўнічаем з Беларускай Праваслаўнай царквой. Цікава, што да нас прыходзяць вучыцца дочкі святароў, каб звязаць жыццё з музыкай і пасля стаць рэгентамі. Існуе праект "Духоўная прыгажосць", па якім нашы хлопцы ездзяць у сацыяльныя прытулкі або запрашаюць іх насельнікаў у каледж, каб паказаць свае творчыя здольнасці. Акрамя гэтага ў нас ёсць унікальны ў рэспубліцы праект сумесна з Полацкім дзяржаўным універсітэтам, згодна з якім нашы навучэнцы разам з выкладчыкамі кожную сераду выступаюць у ПДУ, калі студэнты адпачываюць ад вучобы".

Наталля Молісава сцвярджае, што гонар Наваполацкага музычнага каледжа яго супрацоўнікі. Тут працуюць кампазітары Віктар Малых і Леанід Маліноўскі, творы якіх іграюць аркестры рэспублікі і блізкага замежжа. З імі навучэнцы факультатыўна пішуць музыку. А гэта рэдкі досвед. У каледжы — дзевяць творчых калектываў, сярод якіх аркестр баянаў і акардэонаў са званнем народнага пад кіраўніцтвам Аляксандра Кандрацюка. Ён мае разнапланавы рэпертуар, які ўключае класіку, арыгінальныя фальклорныя партытуры, сучасную музыку. Адмысловая ўвага надаецца творам беларускіх аўтараў, фантазіям на народныя тэмы, якія нярэдка ўключаюць элементы тэатралізацыі. У каледжы вельмі яркі акадэмічны жаночы хор "Мірум". Кіруе ім Святлана Трушына. Сёння тут 32 дзяўчыны, і кожны год на месца выпускніц набіраюць новых спявачак. Святлана Васільеўна — сапраўдны педагог, які любіць сваю справу. У хоры "Мірум" рэпертуар разнастайны, тут спяваюць ад сучаснай і лёгкай да сур'ёзнай музыкі. У 2020 годзе ансамблі "Рэчанька" і "Лаўрыта" сталі стыпендыятамі Прэзідэнцкага фонду. Распавядаць аб заслугах і дасягненнях калектываў каледжа можна шмат.

Хоць у наступным годзе каледжу споўніцца 55 год, але Наталля Молісава ва ўстанове ўсяго трэці дырэктар. Для Наталлі Іванаўны важна трымаць каледж у належным парадку, супрацоўнічаць з дзяржаўнымі службамі і апраўдваць традыцыі сваёй установы. Яе сакрэт — ствараць камфортную працу з калектывам выкладчыкаў. Нядаўна, у тым ліку дзякуючы заслугам дырэктара, каледжу перадалі тры мультыборды ад міністэрства адукацыі, якія нашмат дапамаглі палепшыць адукацыйны працэс.

Яшчэ адзін чалавек, якім ганарыцца Наваполацкі музычны каледж, — Міхаіл Івашкін, знакаміты настаўнік баяніста-віртуоза, лаўрэата разнастайных сусветных конкурсаў Уладзіслава Плігаўкі. Я не мог не спытаць, ці памятае Міхась Іванавіч Уладзіслава:

"Помню і вельмі рады за ўсе яго заслугі, атрыманыя вялікай працай, — кажа настаўнік. — Першыя крокі ў музыцы ён пачаў рабіць у пяць з паловай гадоў з маёй дапамогай. Яго бацька папрасіў пазаймацца з ім, бо ўбачыў, што іншыя дзеці ў малым узросце таксама ўмеюць добра граць. Я да яго працаваў толькі з падлеткамі, але ў той жа час у мяне была цікаўнасць паспрабаваць. Было бачанне, як вучыць малога граць. Я раздабыў яму маленькі баян, даваў спачатку вучыць невялічкія п'есы, каб развівалася памяць, і маторыка пальцаў, вучыў з ім ноты. У выніку Уладзіслаў цяпер — сусветнае імя ва ўсіх краінах, дзе шануюць музыку. Пагаварыце лепш з ім самі.

А я сам не з музычнай сям'і. Стаў служыць гэтаму мастацтву выпадкова. На маёй радзіме ў Віцебску ў нас у пад'ездзе быў умелы гітарыст, па прафесіі пячнік, які пад настрой выходзіў граць на лавачцы. Мне вельмі спадабаліся яго навыкі, і я папрасіў бацьку купіць мне балалайку. Хутка разабраўся, што гэтая прылада не падыходзіць маёй натуры, і я папрасіў купіць мандаліну, дзе трэба было граць ужо медыятарам. Тады мне было 14 год. Неўзабаве мае сябры захацелі паступіць у Віцебскую музычную вучэльню, а мне стала крыўдна, што яны сыходзяць у новае жыццё, а я застаюся. Таму я таксама пайшоў туды. Але на мандаліне там не спецыялізаваліся, ды да таго ж я не ведаў нот. Тым не менш я спадабаўся прыёмнай камісіі, бо ў мяне было пачуццё рытму і слых, і да таго ж добрыя адзнакі ў школе. У выніку мне параілі паступіць на аддзяленне баяна. Я падаў дакументы і пазней убачыў сябе ў спісах на паступленне, чаму быў вельмі рады".

Міхаіл Іванавіч — асаблівы чалавек для краіны, ён падрыхтаваў вялікую колькасць майстроў музыкі. Выкладчыкі Наваполацкага музычнага каледжа расказваюць, што ў краіне няма ніводнага падобнага выкладчыка яго ўзроўню. За сваю працу настаўнік быў узнагароджаны медалём "За працоўныя заслугі", але не менш шануе добрае стаўленне калег і павагу вучняў.

Здаецца, не ў кожным рэгіёне можна знайсці такую ўстанову адукацыі, дзе працуюць столькі заслужаных дзеячаў культуры, як на Наваполаччыне. Наваполацкі дзяржаўны музычны каледж пасапраўднаму зможа зрабіць з дзіцяці прафесіянала сваёй справы. "Культура" будзе расказваць сваім чытачам і пра іншыя навучальныя ўстановы ў сферы культуры.

Фільму “Ідзі і глядзі” ўжо без малага сорак гадоў, але да дрыжыкаў ён працінае па-ранейшаму. І справа не толькі ў неаспрэчным таленце яго рэжысёра ды іншых стваральнікаў, але таксама і ў вусцішнай тэме, якую яны так бескампрамісна ды бязлітасна ўзнялі.
Гэтай “нязручнай” для любой нармальнай псіхікі старонкай гісторыі — злачынствам карнікаў на акупаваных тэрыторыях — здавён цікавіцца і маскоўскі рэжысёр-дакументаліст Леанід СІТНІКАЎ. Цяпер ён адначасова працуе над дзвюма сумеснымі беларуска-расійскімі стужкамі. Першая прысвечана пакручастым і драматычным акалічнасцям стварэння кінашэдэўра Клімава, а другая — яго адмоўным героям.

Ілья СВІРЫН

Глядзець і памятаць несупынна

— Пра здымкі “Ідзі і глядзі” сказана ўжо нямала. Чаму ў вас узнікла жаданне зноў звярнуцца да гэтай тэмы?

— Найперш гэта, напэўна, асабістае. Калі я вучыўся на Вышэйшых рэжысёрскіх курсах, Элем Клімаў, як і многія іншыя выбітныя майстры, чытаў у нас лекцыі. Мне яны надоўга запомніліся, дый сама магчымасць наўпрост стасавацца з мэтрам стала падарункам лёсу. Даўно адчуваў, што павінен неяк вярнуць гэтую пазыку. І вось цяперашні фільм — своеасаблівая спроба лёсу аддзячыць.

Другі фактар — пієтэт да творчасці Алеся Адамовіча. На мой погляд, у Расіі гэты вялікі пісьменнік сёння недааценены. Перавыданняў яго класічных твораў няма, і гэта няправільна. Каб была мая воля, абавязкова ўвёў бы ў школьную праграму хаця б пару раздзелаў з дылогіі “Партызаны”. Спадзяюся, наш фільм выкліча новы ўспляск інтарэсу да гэтай постаці.

І самы важны момант. Сёння ў моладзі стаўленне да нацысцкай ідэалогіі зусім не такое востра негатыўнае, як у пару майго юнацтва. У нас была свайго кшталту калектыўная прышчэпка: фільмы, кнігі, адмысловыя ўрокі... Але ад пакалення да пакалення эмоцыі неяк затухаюць. І гэта, на мой погляд, вельмі небяспечна. Чалавек малады можа падхапіць такую заразу проста праз сваю наіўнасць, цягу да адрэналіну, памкненне кінуць выклік устаялым нормам... Пагатоў, самарэалізоўвацца ў негатыве, у руйнаванні куды прасцей, чым на стваральнай ніве. Каб такое здаралася як найрадзей, трэба ўвесь час нагадваць сабе і нашым дзецям, што ж такое нацызм насамрэч.

— Ці даведаемся мы з вашай стужкі нешта новае, эксклюзіўнае пра “Ідзі і глядзі”?

— Думаю, так. Але пакуль не буду раскрываць усе карты. Можаце лічыць гэта маёй забабонлівасцю або памкненнем захаваць інтрыгу... І дачакайцеся прэм’еры.

— А наколькі складана рэжысёру рабіць фільм пра фільм?

— Хачу, каб у нас усталявалася такая традыцыя: здымаць фільмы пра фільмы. Пагатоў, у заходнім кінематографе гэта даўно ўжо нешта звыклае і нават неабходнае, а некаторыя такія дакументальныя стужкі — скажам, пра здымкі “Апакаліпсіса сёння” Копалы — самі бралі прызы на прэстыжных фестывалях.

— Пра карнікаў напісана і знята ўжо вельмі шмат як мастацкіх, так і дакументальных твораў. Ці няма тут небяспекі цытавання адно аднаго?

— Галоўны прынцып нашай студыя “Канцэпт-С” — прыцягненне новых крыніц у адлюстраванні тых тэм, якія камусьці могуць падацца зацёртымі. Па сваёй першай прафесіі я крыніцазнаўца і дасюль шмат працую ў архівах — у тым ліку і з фота-, кіна— і аўдыядакументамі. Дарэчы, хацеў б падзякаваць Музею кіно і асабіста Алегу Аўдзееву і таксама Беларускаму дзяржаўнаму архіву кінафотафонадакументаў і асабіста Андрэю Ганчару за дапамогу ў нашай працы.

Навукоўцы ў асноўным надаюць увагу пісьмовым крыніцам, а ўсе астатнія застаюцца на перыферыі ўвагі. Пагатоў, візуальны матэрыял патрабуе ад даследчыка болей высілкаў і пільнасці: скажам, не так і лёгка адрозніць дакументальныя кадры ад пастановачнай фальсіфікацыі. Але я перакананы, што без выкарыстання гэтых крыніц адэкватная карціна гісторыі XX стагоддзя ў нашай свядомасці не складзецца.

Вось і ў новых фільмах будзе шмат невядомых раней фота. У акупантаў у кожнай роце былі дзясяткі фотаапаратаў і нават аматарскіх кінакамер. Немцы ў ахвоту здымалі ўсё, што яны бачаць і робяць. Скажам, можна сустрэць нямала партрэтаў на фоне павешаных. Ёсць знакамітая серыя фота, якая карпатліва дакументуе, як казак з ліку калабарантаў на скаку адсякае галаву палоннаму. Урэшце, напрыканцы 1941 года кіраўніцтва рэйха такія здымкі забараніла, але назапашана іх усё адно вельмі шмат. Такія фота дазваляюць нам адчуць атмасферу таго, што рабілася падчас акупацыі.

Яшчэ адна своеасаблівая разнавіднасць гістарычных дакументаў — тая нямецкая кінапрапаганда, што выпускалася адмыслова для акупаваных тэрыторый: вытворчасцю такой прадукцыі займаліся адразу некалькі студый, якія нават паміж сабою канкурыравалі. Учэпістае вока даследчыка адшукае ў гэтых кадрах багата істотных дэталяў.

— Адпаведна, вы лічыце, што тэма нацысцкіх злачынстваў дасюль поўнасцю не раскрытая?

— Што вы, я ніколі ў гэтым не сумняваўся! Але пошук ідзе несупынна, у грамадскі ўжытак уводзяцца ўсё новыя і новыя крыніцы, адкрываюцца не вядомыя раней факты. Скажам, днямі ў мяне запланаваная камандзіроўка ў Слуцк. Не так даўно мы звярнуліся да дакументаў, якія апавядаюць пра карную аперацыю, што прайшла там яшчэ ў 1941 годзе (гісторыкі добра ведаюць пра трагедыю 1943-га, але яна была не адзінай). Прычым, што вельмі важна, гэта справаздачы саміх немцаў. І ўявіце сабе: акупацыйнае камандаванне было абуранае бясчынствамі літоўскіх паліцаяў! Верагодней за ўсё, карнікі ставілі перад сабой мэту найперш рабаваць. Урываюцца ў хаты, бачаць, што гаспадары заможныя — і адразу да сценкі... Акупанты са сваім культам “орднунга” ад такой сваволі трохі ачмурэлі.

Карціна зверстваў нацыстаў ды іх памагатых яшчэ далёка не поўная. Таму нам ні ў якім разе нельга спыняцца, задавальняцца тым аб’ёмам ведаў, які сёння дасяжны. У Расіі ёсць адмысловая служба, якая займаецца пошукам пахаванняў не вайскоўцаў, а менавіта ахвяр сярод мірнага насельніцтва. Каб натрапіць на гэтыя жудасныя адмецины вайны, трэба валодаць спецыяльнай методыкай: яны ўжо фактычна сцёртыя з аблічча зямлі. Адзін з нашых фільмаў, сярод іншых гісторый, распавядзе і пра некалькі зусім нядаўніх адкрыццяў пашукавікоў-прафесіяналаў у Пскоўскай вобласці.

— Можа, пасля доўгіх месяцаў працы вы здолееце сфармуляваць адказ на тое пытанне, якое, пэўна, усіх найбольш хвалюе: як і чаму звычайны чалавек раптам пераўтвараецца ў істоту, горшую за звера?

— Ведаеце, я лічу, што дакументальнае кіно не павінна адказваць на пытанні — як і наогул мастацтва, па вялікім рахунку. Дый у сціслых часавых рамках фільма гэта і немагчыма. Наша задача — пытанні ставіць, прымушаць над імі задумацца, што не так і лёгка ў мітуслівай паўсядзённасці, у гэтай несупыннай барацьбе за выжыванне.

Што да вашага пытання... Працоўная назва фільма пра карнікаў (а магчыма, нават канчатковы варыянт) — “Цемры аддаўшыся”. У чым сутнасць? Падчас праваслаўнага Таінства хросту той, хто яго прымае, публічна выракаецца сатаны. У свядомым веку сам, а калі хрысціцца немаўля, гэта робяць яго хросныя бацькі, абавязаныя выхоўваць дзіця так, каб яно захоўвала вернасць клятве. Большасць тых, хто займаўся экзекуцыямі, таксама былі ахрышчаныя ў той ці іншай канфесіі. Але сваімі зверствамі яны адракліся ўжо ад Бога. Парушылі клятву і абралі цёмны бок. Яны злачынцы не толькі ў чалавечым плане, але таксама і перад абліччам Творцы. Трэба заўсёды ўсведамляць той універсалізм маральнага выбару, які так востра адлюстраваны ў творах Адамовіча і Быкава.

Гэтая тэма для мяне вельмі важная, бо сёння цалкам відавочна: многія людзі забылі пра маральны закон, пра тое, што яны хрысціяне. Як можна апраўдваць тое зло, якое чынілася ў масавых маштабах? А такое апраўданне адбываецца, скажам, у краінах Балтыі.

> *“Карціна зверстваў нацыстаў ды іх памагатых яшчэ далёка не поўная. Таму нам ні ў якім разе нельга спыняцца, задавальняцца тым аб’ёмам ведаў, які сёння дасяжны.*

Маю яшчэ адзін аргумент на карысць таго, што такая размова з гледачом неабходная. У фільме мы распавядзем пра некалькі вельмі прыкрых выпадкаў, калі ў пагоні за прыбыткам людзі губляюць самае святое. І на месцы, дзе нацысты праводзілі масавыя расстрэлы, будуюцца прадпрыемствы альбо нават забаўляльныя аб’екты. Гэтага ні зразумець, ні апраўдаць немагчыма. Скажам, у Ленінградскай вобласці летась пашукавікі знайшлі воінскае пахаванне. А ўласнікі гэтай тэрыторыі спрабавалі яго знішчыць, каб працэс мемарыялізацыі не нашкодзіў іх планам на будаўніцтва! На шчасце, грамадская ўвага не дапусціла гэтага варварства.

Сур’ёзныя дакументальныя фільмы на буйныя расійскія тэлеканалы амаль не дапускаюць. Аднак мы ўсё адно шукаем і знаходзім нейкія магчымасці прабіцца да гледача.

— Скажыце шчыра: а ці можа быць нейкая сфера існавання для дакументальнага кіно, апрача профільных фестываляў?

— Можа. Перш-наперш — сістэма адукацыі. Тут я папраўдзе ведаю, пра што кажу. Некалі, яшчэ ў 90-я, у мяне з’явілася ідэя зняць кіно пра школу. Каб належна занурыцца ў тэму, я з год папрацаваў настаўнікам гісторыі старэйшых класаў. І зразумеў, што касета з дакументальным фільмам — найлепшы метадычны матэрыял. Спярша прагляд, потым абмеркаванне — і вучні ўжо зусім іначай успрымаюць выкладзеныя ў падручніку факты.

— Арганізаваныя прагляды таго ж “Ідзі і глядзі”, на якіх ля кінатэатраў дзяжурылі хуткія, у свой час выклікалі крытыку. Ці трэба гэтак шакаваць юнага гледача?

— Мастацтва — гэта заўсёды шок, а не пяшчотнае пагладжванне па галоўцы. Тым болей калі гэтае мастацтва — праўдзівае. А вось паўпраўда... Лічу, яна прыпадобніць нас да тых, хто займаўся маніпуляцыямі масавай свядомасцю. Таму трэба быць цалкам шчырымі перад самімі сабою і тымі, да каго мы звяртаемся.

Іншая справа, што ўспрымаць такое кіно таксама трэба вучыць — як і добрыя кнігі чытаць. Раней, стагоддзі ў XIX, удумліваму чытанню вучыла бабуля або нянька (згадайма хаця б Арыну Радзівонаўну!), але цяпер гэтага ўжо няма. Таму наша задача — знайсці новыя спосабы ўключэння маладога пакалення ў культурную традыцыю.

— А як вы сёння гэта ўяўляеце?

— Варыянтаў можа быць шмат. Прыгадваецца, скажам, цудоўны прыклад Уладзіміра Мулявіна. Уральскі хлопец прышчапіўся да беларускага фальклору і даў старадаўнім традыцыям другое дыханне. Мноства сучаснікаў усвядомілі сваю нацыянальную ідэнтычнасць менавіта з яго дапамогай.

— Як бачу, у нашай культуры вы абазнаны няблага, хаця каранёў беларускіх не маеце. Адкуль такі інтарэс?

— Маім даследчыцкім інтарэсам здавён былі культурныя сувязі: руска-англійскія, руска-нямецкія, руска-французскія... І руска-беларускія, вядома, таксама. Ніводная культура не можа быць ізаляванай. А для ўзаемаўзбагачэння вельмі важна разумець, чым дыхае твой сусед, што ён цяпер адчувае. Вось я і стараюся заставацца цікаўным.

К

Супраць мін, супраць вайны: прэм'ера фільма

Значнай падзеяй у беларускай кінапрасторы павінны стаць прэм'ерны паказ новага іграваога серыяла, праца над якім ішла цягам мінулага года. Для Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" гэта першая прэм'ера 2022 года, і адразу — вялікая і прыкметная. 22 лютага на тэлеканале "Беларусь 1" пачнецца паказ васьмісерыйнай стужкі "Полымя пад попелам": у адным сюжэце злучаюцца гісторыі сапёраў пасляваеннага 45-га года і нашых часоў.

Надзея КУДРЭЙКА

Прэм'еру серыяла "Полымя пад попелам" у нейкім сэнсе можна назваць і даўно чаканай: апошнімі гадамі "Беларусьфільм" праходзіў працэс рэфармавання, вырашаў праблемы і прэм'ерамі ў іграваым кіно не радаваў. Прынамсі, калі казаць менавіта пра свой, нацыянальны прадукт, а не пра стужкі іншых краін, знятыя пры ўдзеле "Беларусьфільма". Так, "Полымя пад попелам" — менавіта нацыянальнае кіно, з беларускімі аўтарамі, акцёрамі і прадзюсарамі. Сцэнарый напісалі Юлія Ляшко і Людміла Перагудава, а рэжысёрам стаў Іван Паўлаў, вядомы аматарам кіно такімі карцінамі, як "На спіне ў чорнага ката", "Глыбокая плынь", тэлесерыялам "Ой, ма-мач-кі!..". З 22 лютага тэлеканал "Беларусь 1" пачне кожны дзень дэманстраваць па дзве серыі — завершыцца паказ, такім чынам, 25 лютага.

Для таго каб прыцягнуць увагу гледачоў, маецца інтрыгуючы сюжэт, у якім перакідваецца мосцік паміж пасляваенным часам і нашым. У сучаснасці на пляцоўцы, дзе плануецца правядзенне міжнароднага турніру па страйкболе, будаўнічая тэхніка за некалькі тыдняў да пачатку спаборніцтва выварочвае з зямлі снарад, што ляжаў там з вайны. Цяпер турнір пад пытаннем. А ў ім марыла паўдзельнічаць маладая дзяўчына Чэслава — дачка галоўнага героя стужкі падпалкоўніка Аляксея Акуліча (яго ў фільме сыграў Максім Паніматчанка), які служыць у супрацьмінным цэнтры Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Абясшкодзіць снарад — такая перад ім была задача. Турнір у выніку не адмяняецца, але ў час яго правядзення Чэслава і Артур — сын бізнесмена, арганізатара спаборніцтваў — правальваюцца ў старую зямлянку...

Пасляваенны час: будучы яшчэ 16-гадовым падлеткам, дзед падпалкоўніка Акуліча ў якасці дабравольца ОСОАВИАХИМа (Таварыства садзейнічання абароне, авіяцыйнаму і хімічнаму будаўніцтву) разам з іншымі такімі ж юнымі хлопцамі і дзяўчатамі шукае і абясшкоджвае смертаносныя міны і снарады, што засталіся ў Мінску і ў яго ваколіцы пасля вызвалення ад фашыстаў. Цяпер гэта справа прафесіяналаў, а тады зямлю, набітую падобнай спадчынай вайны, ратавалі і дабравольцы, што праходзілі падрыхтоўку цягам 70 гадзін. Гэта рэальны факт: пры вызваленні Беларусі галоўныя гарадскія аб'екты разміравалі вайсковыя сапёры, а пасля таго, як фронт рушыў на захад, справу ўзялі на сябе маладыя дабравольцы, што па ўзросце яшчэ не патрапілі на фронт. Канешне, у фільме ёсць месца і для кахання, і для рамантыкі, і для здрады, і для геройскіх учынкаў. У кожнага юнага дабравольца ОСОАВИАХИМа — свая гісторыя, што падштурхнула яго запісацца ў сапёры, свае мары і жаданні.

Здаецца, столькі часу мінула, але з водгуллем той вайны сучасным сапёрам даводзіцца змагацца дагэтуль. Лічбы ўражваюць: толькі за мінулы год, калі здымаўся фільм "Полымя пад попелам", супрацьмінны цэнтр Узброеных Сіл Беларусі абясшкодзіў і знішчыў больш за 25,7 тысячы выбухованебяспечных прадметаў, якія знаходзіліся ў зямлі з часоў Другой сусветнай вайны. Натуральна, яшчэ на этапе падрыхтоўкі фільма да праекта далучыліся і спецыялісты з Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь: здымачную групу кансультавалі менавіта супрацоўнікі супрацьміннага цэнтра.

Для ўзмацнення эфекту стваральнікі кіно вырашылі дапоўніць ігравыя сцэны дакументальнымі кадрамі з працай сапраўдных сапёраў, знятымі летам мінулага года, а таксама архіўнай хронікай Мінска 44-га года. Аператар фільма Вячаслаў Дунаеў выязджаў з калегамі ў Докшыцкі раён на месца правядзення рэальных работ па размініраванні, каб на свае вочы ўбачыць, як сёння выглядае дзейнасць сапёраў: "Так, у параўнанні з пасляваенным часам яны маюць у сваім арсенале не толькі шчупы з металадэтэктарамі, але і найноўшую тэхніку і адпаведную амуніцыю... Але ж усё роўна — яны штодня сутыкаюцца з тым, што з часу вайны не страціла сваёй небяспечнасці. Пры нас на полі, дзе да гэтага шмат дзесяцігоддзяў пасвіліся каровы, сапёры літаральна за пару-тройку гадзін сабралі некалькі дзясяткаў мін, склалі іх у вялікую яміну і падарвалі. Натуральна, за самім падрывам нам дазволілі назіраць з даволі вялікай, бяспечнай адлегласці, але ўражанні ўсё роўна былі надзвычай моцныя, як і выбуховая хваля. Акурат пасля гэтай "рэаліці-экскурсіі" мы з рэжысёрам канчаткова ўпэўніліся ў тым, што жадаем уключыць у будучы фільм не толькі мастацка-пастановачныя, але і рэальныя, дакументальныя здымкі таго, што ж сабой уяўляе рэальны выбух міны. Каб ніхто не думаў, што сёння гэта ўжо ўсяго толькі ржавыя жалязячкі, якія валяюцца ў зямлі".

Кінастудыя разлічвае, што дзякуючы сваёй тэме серыял зацікавіць не толькі беларускіх гледачоў, а будзе запатрабаваны як мінімум і ў нашых блізкіх суседзяў. На жаль, тэма размініравання застаецца актуальнай, нават калі гаварыць хоць бы пра тое, што нам пакінула вельмі даўняя вайна. Рэжысёр Іван Паўлаў, пачаўшы працаваць над праектам, быў уражаны тым фактам, што, аказваецца, сама зямля паступова, на 1 см на год, выціскае небяспечнае жалеза на паверхню.

Серыял "Полымя пад попелам" здымаўся, натуральна, на тэрыторыі Беларусі. Асноўную частку знялі на натурнай пляцоўцы кінастудыі паблізу Смалявіч, а над тым, дзе знайсці атмасферу амаль цалкам разбуранага пасляваеннага Мінска, давялося падумаць — і падышла такая лакацыя, як тэрыторыя старога завода ў Бабруйску. Серыял, акрамя ўсяго іншага, дае шанс праславіцца многім маладым беларускім акцёрам. Канешне, на экране мы ўбачым і мэтраў, напрыклад народнага артыста Беларусі Аляксандра Ткачонка ці запрошанага расійскага акцёра Ігара Ясуловіча — народнага артыста Расіі, але большасць герояў стужкі — людзі маладыя, і акцёры, некаторыя з якіх толькі-толькі скончылі Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, сыграюць літаральна свае першыя значныя ролі ў кіно.

Нагадаю, прэм'ера адбудзецца 22 лютага на тэлеканале "Беларусь 1": кожны дзень па дзве серыі запар у рэйтынгавы час. Пасля серыял можна будзе пабачыць на тэлеканале "Беларусь 3". Генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Уладзімір Карачэўскі, прадстаўляючы стужку на перадпрэм'ерным паказе, адзначыў: "Гэта наша першая прэм'ера 2022 года — Года гістарычнай памяці. Серыял "Полымя пад попелам" мы прысвячаем і 105-годдзю беларускай арміі. Гэтая гістарычная драма — пераклічка пакаленняў і знак павагі да тых, хто нам падарыў мір і хто пасля вайны адраджаў нашу зямлю. Важна памятаць сваю гісторыю і не забываць".

Афіша Тэатра-студыі кінаакцёра паболела на новае найменне — “Мікітаў лапаць” Міхася Чарота. Зварот да нашай драматургічнай спадчыны пачатку 1920-х з яе ідэалізаваным жыццём беларускай вёскі стаў не звыклай камедыяй, як гэта пазначана ў аўтара, а гэткай стылізаванай і вельмі стыльнай віньеткай, унутры якой — ажыльія лялькі ды выбеленыя статуэткі.

Надзея БУНЦЭВІЧ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Дар'я Карпечанкова (Зоська), Чэслаў Вількін (Саўка).

“Мікітаў лапаць” з антычнай шнуроўкай

Юлія Палубінская (Грыпіна), Анжэла Караблёва (Дар'я).

Дзмітрый Ягораў (Мікіта).

П'есу гэтую ставілі многа. Яна як мага лепей адпавядала нацыянальным памкненням пачатку стагоддзя і далейшых першых паслярэвалюцыйных гадоў. Прэм'еру ажыццявіла Першае беларускае таварыства драмы і камедыі, ролю Мікіты выконваў сам аўтар. А далей — пастаноўкі панеслася адна за адной, у тым ліку ў разнастайных аматарскіх калектывах. Акурат да 1937-га, калі пісьменніка расстралялі. У канцы 1950-х, праўда, рэабілітавалі, але частка яго твораў была страчана. Новы віток цікавасці да “Мікітава лапця” прыпаў на перабудову і Незалежную Беларусь. У 1982-м тэкст быў адноўлены з таго часу добра зашмальцаваны аматарскімі гуртамі, уключаючы школьныя. А чаму б і не? Можна спынніца на шасці цэнтральных персанажах, а можна вывесці на сцэну столькі “аднавяскоўцаў”, колькі дазваляюць яе памеры. Можна пакінуць толькі тэкст, дзе шмат сакавітых беларускіх лаянак, а можна аздобіць яго народнымі песнямі ды танцамі — наколькі хопіць мастацкага густу і пачуцця меры.

З побытавай гісторыі пра тое, як дзве суседкі пасварыліся, а потым памірыліся, дазволіўшы дзецям пабрацца шлюбам, пастаноўчая каманда на чале з рэжысёрам Алегам Кірэевым зрабіла спектакль надзвычай цнатлівым, далікатна крохкім, да якога можна дакранацца толькі з чыстай душой і добрай, незласлівай усмешкай. Такое адчуванне ўзнікае дзякуючы найперш сцэнаграфіі, касцюмам і, шырэй, аблічам персанажаў, што створаны маладой мастачкай Лідзіяй Малашэнка. Ніякай “бытавухі”, лубочнай пярэстасці, бо асноўнай ідэяй стала выцінанка. Тая ж “лялечная” тэматыка захавана ў аблічах герояў: бялюткія строі з ледзь заўважнай, быццам накрытай туманамі нацыянальнай вышыўкай, белыя вусы-валасы са знарок падкрэсленай паклі. Яўмень ды Саўка з надзьмутымі плячыма ды біцэпсамі нападаюць маляваных асілкаў. Зоська з наўмысна шырокімі сцёгнамі адпавядае народным уяўленням жаночай прыгажосці: такая дзяўчына народзіць здаровых нашчадкаў. Грыпіна з мятлой у руках гарэзліва бегае на абцасіках, маўляў, шляхта!

Адкрытая завеса дапамагае прыняць прапанаваныя ўмовы гульні яшчэ да пачатку спектакля. Дзве бялютка-папяровыя, “выразаныя нажніцамі” хаткі з пеўнікамі на даху, два платы, дзве лавы, толькі калодзеж адзін. Няўжо і сапраўды сіметрыя, дакладныя паўторы? Ажно не, хутчэй развіццёвая забаўка накшталт “Знайдзі дзесяць адрозненняў”. Бо ў адной з хатак вокны-дзверы пахіленыя, дый арнаменты на лавах розныя. Але ж парнасць вобразаў у наяўнасці: сякера ля адной з хатак перагукаецца з касой ля другой, нават месяц мае сваю пару — сонейка.

Змену дня і ночы рэгулюе Мікіта: вывешвае на задніку адпаведнае свяціла. Праз гэтую ды іншыя амаль незаўважныя дэталі герой рушыць на мяжу рэальнасці (хай сабе і лялечнай, у адпаведнасці з агульнай эстэтыкай спектакля) і адухоўленай сімволікі, з вясковага дурня-недарэкі ўзрастае да гуллівага эльфа з шэкспіраўскага “Сну ў летнюю ноч” і, шырэй, да гэткага амурчыка крыху на сельскі лад. Такія дахрысціянскія ўяўленні пра багоў з чалавечымі характарамі пазней прыпадносіліся ў камічным плане, што ўласціва і беларускай школьнай оперы XVIII стагоддзя “Апалон-заканадаўца, ці Рэфармаваны Парнас” Рафаэла Вардоцкага, і знакамітаму “Тарасу на Парнасе”, які ў 1927 годзе атрымаў увасабленне ў аднайменнай оперы Мікалая Аладава. У пастаноўцы ж “Мікітава лапця” згаданае злучэнне беларускай народнай стыхіі з антычнасцю заяўлена з самага пачатку дзеі: гасне святло, а як запальваецца зноў, мы бачым на сцэне “мармуровыя” антычныя статуі — “скульптурныя” постаці сяляначак ды вясковых хлопцаў. І міжволі ўзнікае думка пра падабенства лапцей да антычных сандаляў з высокай шнуроўкай.

У музыцы Валерыя Воранава, створанай з вялікім і папраўдзе высокім густам, знойдзена тая ж гармонія між фальклярызмам і шматвекавымі акадэмічнымі традыцыямі. Замест народных песень, пазначаных у арыгінале, скарыстаны іншыя, больш папулярныя сёння — той жа “Рэкрут” (“Біла дзеўку маці”) з рэпертуару “Песняроў”, што спяваюць суседкі ў час прымірэння. Гэта сцэна перанесена ў лазню, каб разнастаіць дзеянне. З той жа мэтай да тэксту М. Чарота дададзены “голас ад аўтара” — гэткі каментар нябачнага вядучага. Асобная разынчка — харэаграфія Наталлі Фурман, дзе няма ніякаватых “агульных формаў руху”, а кожная дэталь пазначана адметным “смакам-водарам”: фінальны танец пачынаецца з “тупацення”, заяўлена ў літаратурным тэксце, полечка спалучаецца з “лялечнай” хадой і элементамі сучаснай дыскатэкі. А ўсё разам сведчыць пра лёгкі постмадэрнісцкі шарм той беларускасці, што чым далей, тым больш асэнсоўвае сваю еўрапейскасць і ўпісанасць у сусветны мастацкі працэс.

Два гады таму жывапісцу Леаніду Хобатаву споўнілася семдзесят год. Персанальную выставу з гэтай нагоды мастак зладзіў толькі цяпер. Мяркую, чакаў, калі пад яе вызваліцца прастора на самай прэстыжнай экспазіцыйнай пляцоўцы краіны — у Нацыянальным мастацкім музеі. Атрымалася так, што перад тым, як паглядзець гэтую персаналію, я гартаў зборнік аднаго італьянскага аўтара і зачапіўся думкаю за аповед наступнага зместу. Дзяўчына вельмі пакутуе праз тое, што яна “не такая, як усе”. Каб пазбавіцца сваёй непаўторнасці, яна кладзецца пад нож пластычнага хірурга, змяняе колер валасоў і нават вачэй, больш за тое — прымушае сябе скарэктаваць уласны характар і лад думак, а супакойваецца толькі тады, калі становіцца адзін у адзін падобнай да дзяўчыны з вокладкі моднага часопіса ды чуе ад маладых людзей: “А я вас недзе ўжо бачыў”.
Вось і ў мастацтве такое здараецца: мае чалавек ад прыроды непаўторны талент, а скарыстоўвае на тое, каб быць “як усе”, уплішчыцца ў нейкі эталон. У старажытнасці гэта называлася “закапаць талент у зямлю”.
Дык вось, мастак Леанід Хобатаў не такі!

Першы снег. 2020.

Лёс. 2019.

Фрагмент экспазіцыі.

Прыгажосць, што прымушае думаць

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Наколькі я яго ведаю, ён ніколі не імкнуўся далучыцца да нейкай плыні ці да раскручанага брэнда — інакш кажучы, стаць такім, як усе. Ён з тых, каго цяжка, а мо і ўвогуле немагчыма паставіць у шыхт і прымусіць ісці з кімсьці ці з чымсьці нага ў нагу. Неяк спадар Леанід расказваў, што калі служыў у войску, дык спецыяльна прыдбаў сабе, фактычна выцыганіў у інтэнданта на складзе, такую гімнасцёрку, якая толькі фармальна адпавядала салдацкай уніформе. Яму проста вельмі хацелася вылучыцца з шыхта!

Беручы да ўвагі ягоны творчы менталітэт, можна лічыць, што спадару Леаніду пашчасціла самасцвярджацца ў 80-я гады, на якія прыпадае так званая перабудова — то-бок спантанны пошук выйсця з тупіка, у якім на той момант цалкам заканамерна аказалася савецкае грамадства і дзяржава. Леанід Хобатаў і такія, як ён, атрымалі магчымасць фармаваць уласны стыль, не азіраючыся на ідэалагічныя каноны і эстэтычныя стэрэатыпы.

Адным з яскравых сімвалаў перамен, справакаваных перабудовай на культурніцкім абшары, стала ўтварэнне творчай суполкі “Нямігі-17”. Леанід Хобатаў быў сярод ініцыятараў гэтай справы. Фармальна ўсё выглядала так, нібыта група мастакоў, што мелі майстэрні ў новым гмаху на Нямізе, аб'ядналіся, каб было зручней ладзіць выставы ды вырашаць іншыя практычныя пытанні, датычныя прафесійнай дзейнасці. Але па збегу абставін гэтыя мастакі аказаліся яшчэ і аднадумцамі. Спалучэнне “мастакі-аднадумцы” патрабуе тлумачэння: як ужо адзначалася вышэй, не ходзяць мастакі шыхтамі. Сутнасць аднадумства ў дадзеным выпадку зводзілася да разумення, што яднае творцаў не ідэалагічны канон ці адзінства стылістыкі, а прага самасцвярджэння, павага да такога ж памкнення калегі і пэўныя маральна-этычныя прынцыпы. Усё гэта ў “Нямігі-17” было. Кожны творца ўнікальны, а разам яны — з'ява, плынь, мо нават школа.

Рэтраспектыва, прадстаўленая на выставе, дазваляе прасачыць стылёвую і эсэнсавую эвалюцыю творчасці Леаніда. Напачатку ён, выхаванец кафедры манументальнага мастацтва, прыўнёс у станковыя карціны ўласцівую сценапісу абагульненасць формы і своеасаблівую брутальнасць. Пазней усё далей адыходзіць ад фігуратыўнасці і набліжаецца да негеаметрычнага абстракцыянізму, хоць і захоўвае рысы фігуратыўнасці.

У ягоных творах, пабудаваных зболышага паводле прынцыпаў асацыятыўнага мыслення, пры пэўнай фантазіі можна ўбачыць і пейзажы, і нацюрморты, і нават партрэты стану душы — і зямлю, і Космас. У залежнасці ад настрою гледача. А зрэшты, гэта проста вельмі прыгожыя рэчы. Прычым гэта тая прыгажосць, што не толькі спрыяе станоўчаму настрою, але і прымушае думаць.

Фота аўтара

Эстэтыка віцебскага авангарду

У лютым па традыцыі да дня нараджэння Казіміра Малевіча ладзяцца розныя праекты і выставы. З прысвячэннем 100-гадоваму юбілею УНОВИС, што адзначаўся пазалетась, у Мінску ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў праходзіць выстава Constructio — праект, як заяўлена, канкрэтна-канструктыўнага мастацтва. На выставе — творы сучасных, у асноўным віцебскіх творцаў. У рамках Constructio віцебская мастачка і мастацтвазнаўца Галіна Васільева — куратар выставы — правяла і прэзентацыю сваёй новай кнігі “Віцебскі авангард у дзеянні”.

Надзея КУДРЭЙКА

Аляксандр Малей, «Кампазіцыя з экспрэсіўнай лініяй», 2014.

Фота аўтара

Дарэчы, амаль адначасова з мінскай выставай і ў Віцебскай абласной бібліятэцы адкрылася выстава праекта “Constructio”, складзеная з твораў самой Галіны Васільевай як мастачкі. Пачатак традыцыі быў у 1993 годзе, і за амаль 30 гадоў праект неаднаразова праходзіў у Беларусі, паказваўся ў іншых краінах. Яго героямі, як правіла, былі віцебскія мастакі. Галіна Васільева зазначае, што ў нейкім сэнсе падобныя праекты для Беларусі ўнікальныя, бо асобныя работы канструктыўнага напрамку не губляюцца сярод іншых твораў, як гэта звычайна здараецца, а прадстаўлены канцэптравана. Да таго ж у Беларусі вельмі нямногія творцы працуюць у эстэтыцы канкрэтна-канструктыўнага мастацтва, а Віцебск яраз славіцца сваім авангардам. І на гэты раз у сталічнай зале НЦСМ на праспекце Незалежнасці можна ўбачыць творы тых віцебскіх мастакоў, з якімі Галіна Васільева ўжо даўно супрацоўнічае.

Не сказаць, што выставачная плошча перанасычана творамі, і спіс мастакоў-удзельнікаў не такі вялікі, як, можа, хацелася б, але ёсць нагода і ўбачыць нешта з фондаў самога НЦСМ — у першую чаргу аб'ёмна-прасторавыя работы знакамітага віцебскага авангардыста Аляксандра Малея, і ацаніць экспазіцыю як твор канцэптуальнага мастацтва. Галіна Васільева сваімі квадратамі з прысвячэннем Малевічу пастаралася пазначыць пункт адліку ад супрэматызму і паразважаць над тым, што ж такое канструктыўнае мастацтва і канкрэтнае мастацтва на прыкладзе прапанаваных работ.

Геаметрычная абстракцыя, мінімалізм, работа з формай і прасторай — паводле куратара Галіны Васільевай, на гэтым робіцца акцэнт Constructio. Сутнасці ідэі, мабыць, найбольш адпавядаюць работы зноў жа Аляксандра Малея. Можна нават проста прашытаваць апісанне аднаго ягонага арт-аб'екта: “Кубаквадрат. Прасторавая структура Заватной інфармацыі” — ён таксама з фондаў НЦСМ. Творы Аляксандра Малея, трэба прызнацца, найбольш прыцягваюць позіркі на выставе. Арт-аб'ект Аляксандра Слепава “Кентаўр, які страляе з лука” наўпрост адсылае да ідэй супрэматызму. Вялікія тэкстыльныя палотны Антаніны Фалей — з “геаметрычнай” серыі “Сіметрыя стварае падзею”. Арт-аб'ект Васіля Васільева “Эшюд” з заточнага каменя захаплівае не толькі выразнай геаметрычнасцю, але і талентам ператварэння самага звычайнага прадмета ў твор мастацтва. На выставе Constructio можна ўбачыць і яшчэ адзін твор Васіля Васільева — вялікую скульптуру “Анёл”, зробленую са старой ванны. Яна, мабыць, не зусім адпавядае заяўленай канцэпцыі канкрэтнага і канструктыўнага мастацтва. Але ж гэта яшчэ адна нагода мінчанам пабачыць твор, які мінулай вясной так усіх захапіў на фестывалі скульптуры SculptFest і ў выніку атрымаў першую прэмію ў намінацыі “Канцэпцыя”. Яскравыя, шматкаляровыя і вялікія па памерах творы мінскай мастачкі Дзіны Даніловіч таксама толькі пасля некаторага роздуму дазваляюць разгледзець у сабе канструктывізм, але геаметрычныя фігуры ў іх дакладна пабачыць можна. Дарэчы, Дзіна Даніловіч вучылася ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным інстытуце і была студэнткай куратара Constructio Галіны Васільевай, якая ў гэтым інстытуце выкладае. Яшчэ аднаго мастака варта згадаць — Уладзіміра Макаркова з абстрактнымі карцінамі на касмічную тэматыку.

Пару слоў варта сказаць пра кнігу, якая прэзентавалася і ў Мінску, і ў Віцебску. Гэта манаграфія Галіны Васільевай “Віцебскі авангард у дзеянні”, якая ахоплівае гісторыю авангардных праектаў Віцебска, пачынаючы з другой паловы мінулага стагоддзя: там артыкулы і пра легендарнага мастака Аляксандра Салаўёва, і пра творчае аб'яднанне “Квадрат”, і пра выставачныя праекты Васіля Васільева Abstract, і пра многае іншае. Кніга можа даць уяўленне пра тое, як Віцебск дзесяці годдзямі падтрымлівае званне цэнтра авангарднага мастацтва.

Мы з вамі займаемся вельмі нясумнай справай. Прынамсі, так яно павінна быць. Нясумная справа — цікавая для цябе і мяне, радасная і светлая. Якая, да прыкладу? Краязнаўства! Многія клубы і бібліятэкі абралі яго для сваіх гурткоў і аматарскіх аб'яднанняў ці не генеральным кірункам дзейнасці. І правільна зрабілі. Іншым разам за спінамі работнікаў культуры на гэтай вясковай ці раённай дзялянцы працы няма больш ніякіх даследчыкаў. Што клубнікі ды бібліятэкары збяруць і запомняць, тое і застанецца. На ўвазе маю дыялекты зніклых вёсак, творы народнага мастацтва, рэчы сялянскага побыту, гідронімы, тапонімы і ці мала яшчэ якія артэфакты. Ведаю бібліятэкарку, якая з неўтаймоўнасцю сапраўднага калекцыянера даследуе гарышчы асірацелых вясковых хат, збірае старыя фотаздымкі. Наколькі ведаю, у замежжы такі занятак даўно лічыцца топавым сярод аматараў даўніны. Доследы гэтыя я назваў бы ўмоўна "Пагартаем дзядулеў фотаальбом". Усё так: за кожным здымкам — лёсы, гісторыя і культура асобна ўзятай сям'і. А ўсё разам і называецца "Радзімазнаўствам". Хто нам замінае ўзяцца талакой за рэалізацыю такога праекта на рэспубліканскім узроўні?

Згадка пра яблыневы сад

На здымках:
1 Новы творчы праект дзейнічае на Слонімшчыне.
2 Падчас экскурсіі ў Кашалёўскай бібліятэцы-клубе.
3 Рэспубліканская міжканфесійная акцыя ў Дварышчанскім вучэбна-педагагічным комплексе.
4 5 Вынік працы лідскіх майстроў і мінскіх даследчыкаў: нацыянальныя касцюмы з віртуальнай энцыклапедыі.

Яўген РАГІН

Любы сталы веткавец распавядзе госцю мястэчка, што ў свеце ёсць два гарады, што маюць Красную (значыць — прыгожую) плошчу. Гэта Масква і Ветка. У апошняй, кажуць, стараверы нават драўляны крэмль узводзілі. Гаворка таксама пра краязнаўства, дзе веданне роднай мовы — абавязковае. Пішу пра гэта таму, што на афіцыйным сайце Веткаўскага райвыканкама пазначаны адрас: "Чырвоная плошча, 7". Вучыце, шаноўныя спадары, матчыну мову! Нашу плошчу ў чырвоны колер ніхто і ніколі не фарбаваў. Яна была і будзе прыгожай — Краснай.

У нашай гісторыі шмат таямнічага і невытлумачальнага. Дзе знаходзіўся і што рабіў Францішак Скарына ў 1513—1516 гадах? Руны на яго гравюрах не расшыфраваныя і па сёння. Усе славяне былі людзьмі ведычнай культуры. Аднак чаму толькі ў беларускай мове засталося слова "веды"? Ці існаваў насамрэч абрад дзядзькавання? Як выглядала гізаўра — баявая сякера нашых старадаўніх ваяроў? А колькі закінутых падземных хадоў ці не ў кожным нашым мястэчку! Спіс дзівосаў можна працягваць доўга. Дык ці варта выдумваць іншыя тэмы для краязнаўчых доўгатэрміновых бібліятэчных ці клубных квэстаў і разменьвацца на пустую драбязу? Нават у сельскіх установах культуры. Архівы чакаюць зацікаўленых даследчыкаў. Урэшце, хто, калі не вы?! Краязнаўства вясковых клуба ды бібліятэкі — гэта не зашмальцаваны агульны сшытак, дзе ад абыякавай рукі занатавана хрэстаматыйныя мясцовая гісторыя. Гэта спроба сур'ёзнага даследавання для надзейнай кансервацыі гістарычнага мінулага канкрэтнага паселішча. Такі "капітал" дапаможа нам разабрацца, што ж мы за нацыя такая — беларусы.

"Ёсць у Прыдзвінні цудоўная вёсачка **Мазалава**, *што раскінулася на беразе рачулкі Лужаснянкі, воды якой упарта бягуць да Дзвіны. Навокал — маляўнічыя лугі, палі і лясы. Колькі тут часу прабавіў у дзяцінстве з сябрамі! А вуліцы Зарэчная, дзе жылі бабуля Галіна і дзед Анатоль... Няма сёння тых бяроз і дубоў, што сустракалі на ўваходзе ў наш гасцінны двор. А яблыневы сад — антонаўка, карабкоўка, белы наліў. Ён быў прыгожы і казачны: увесну — бела-ружовы, улетку — з рознакаляровымі пладамі, увосень — са спелымі яблыкамі і незабыўным водарам, узімку — заснежаны..."* Гэта напісаў Андрэй Струнчанка з **Віцебскага** раёна. І гэта таксама краязнаўства, лірычнае і душэўнае. Мы пісалі, што ў Мазалаве прайшоў конкурс творчых прац пра малую радзіму. Дадзены ўрывак — з такой працы. Трэба не толькі любіць, але і ўмець любоў выказваць. Гэтай мэце ў пэўнай ступені служыць мерапрыемства, пра якое гаворка ў наступным абзацы.

Днямі ў **Дзяржынскім** гарадскім доме культуры прайшоў адкрыты фестываль-конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні, у якім удзельнічала больш за 40 салістаў ад 6 да 15 гадоў. Фэсту сёлета — пяць гадоў. У далейшых планах — пашырэнне геаграфіі конкурсу, які паспеў стаць гарадскім брэндам, і прыцягненне да ўдзелу як мага большай колькасці юных талентаў.

Піша намеснік дырэктара **Зэльвенскай** раённай бібліятэкі Вольга Камякевіч: *"Нацыянальная самасвядомасць нараджаецца і фарміруецца ў нетрах кожнай нацыі. Яна наўпрост звязана з пачуццём любові да бацькоў, родных, дзяцей, да зямлі, на якой нарадзіўся і вырас, да культуры і традыцый роднага краю. У* **Кашалёўскай** *сельскай бібліятэцы-клубе прайшла экскурсія "Тут жыве гісторыя". Гаворка ішла пра лад жыцця нашых продкаў. Юныя чытачы аглядалі пралкі, маслабойкі, кошыкі, збаны, абутак, ручнікі, дзіцячы ложак. А ў* **Князеўскай** *сельскай бібліятэцы адбылося пасяджэнне аматарскага аб'яднання "Сучасніца", арганізаванае ў выглядзе фальклорных пасядзелак "Не цурайся роднай мовы".*

Радзімазнаўству прысвечаны і ліст супрацоўніцы **Сцяпанкаўскай** бібліятэкі **Жабінкаўскага** раёна Ірыны Самасюк. *"У кожнай бібліятэкі, як і ў чалавека,* — піша яна, — *ёсць свая біяграфія. Нашай сёлета — 160 гадоў. Гісторыя ўстановы непарыўна звязана з гісторыяй вёскі. Спачатку была хата-чытальня, потым бібліятэка адкрылася пры народным вучылішчы. Праз час бібліятэка займала памяшканне ў будынку сельскага савета, потым — у будынку калгаснага праўлення побач з Домам культуры. Першым бібліятэкарам быў Андрэй Тамашук. Кожны супрацоўнік пакідаў тут часцінку душы. Яўгенія Кізь адпрацавала, напрыклад, 36 гадоў, а пачынала яшчэ з хаты-чытальні".* У 1996 годзе Ірына Самасюк прыйшла працаваць у бібліятэку і пачала з яе афармлення, хацела, каб тут было ўтульна. Потым узнікла дзіцячае аматарскае аб'яднанне "Лесавік", сябры якога ладзілі вандроўкі па родным краі. А праз час у бібліятэцы з'явіліся камп'ютарная тэхніка і новыя магчымасці. Цяпер у бібліятэцы — 200 чытачоў, якія не ўяўляюць жыцця без кнігі.

Дырэктар **Мастоўскай** дзіцячай школы мастацтваў Алена Кізім таксама ўпэўнена, што любоў да радзімы, як і любоў да мастацтва, пачынаецца з дзяцінства. Я б звёў усё да нескладанай формулы: чым больш творчасці, тым больш любові. Вось пра што канкрэтна распавядае спадарыня Алена: *"За 2021—2022 гады вучні прынялі ўдзел у 75 міжнародных конкурсах (2 Гран-пры і 137 лаўрэацкіх дыпломаў), у 24-х рэспубліканскіх, абласных і рэгіянальных конкурсах (38 лаўрэацкіх дыпломаў).* Што і казаць, статыстыка салідная. Мы пагаварылі з Аленай Чаславаўнай па тэлефоне, яна гарантавала, што наступная публікацыі пра Мастоўскую ДШМ будуць насычаныя не толькі статыстыкай, але і персаналіямі.

Чарговы маніторынг чытацкіх сімпатый адбыўся гэтым разам у **Маньківіцкай** сельскай бібліятэцы **Столінскага** раёна. Пра гэта паведаміла Алена Ворах, загадчык згаданай установы: *"У акцыі-даследаванні прынялі ўдзел 98 чытачоў. Бібліятэку ўпрыгожы-*

ла цудоўнае дрэва, на галінкі якога кожны чытач прымацаваў стужку. Жоўты колер сімвалізаваў кнігі пра прыроду, аранжавы — прыгодніцкія выданні, ружовыя стужкі вывешвалі аматары кніг пра каханне, чырвоны колер сімвалізаваў вершы, а сіні — фэнтэзі, аматары часопісаў абралі белы колер. Пасля стужкі знялі і падлічылі. Перамог ружовы колер. Самымі папулярнымі сярод чытачоў аказаліся любоўныя раманы". Так што ў Манькавічах рэй вядзе каханне.

Пра рэспубліканскую міжканфесійную акцыю "Аднаўленне святынь. Нас аб'ядноўваюць гісторыя і вера" паведаміла бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Лідскай** раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы Кацярына Сандакова. Мерапрыемства прайшло ў **Дварышчанскім** вучэбна-педагагічным комплексе дзіцячы сад-сярэдняя школа і называлася "Калі душа з душою размаўляе". *"Арганізатарамі дыялогу аднадумцаў,* — піша спадарыня Кацярына, *— сталі протаіерэй Георгій Муха, настаяцель храма Святой Сафіі Слуцкай аграгарадка Дворышча; Людміла Марцінкевіч, бібліятэкар мясцовай інтэграванай бібліятэкі..."*

Тэма мінулай вайны — важкі складнік краязнаўства. Пра гэта распавядае загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Ганцавіцкай** цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Васіля Праскурава Таццяна Маляўка: *"У* **Агарэвіцкай** *сельскай бібліятэцы для вучняў малодшых класаў мясцовай школы прайшоў урок гісторыі "Аб той вайне бязлітаснай заўсёды з намі памяць". Агарэвічы ў гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіліся пад акупацыяй. Шмат моладзі было вывезена на працу ў Нямеччыну. Бібліятэкар Валянціна Мініч распавяла пра лёсы гэтых людзей. Дзеці задавалі пытанні, разглядалі ўзнагароды ветэранаў".*

Новы праект абвясцілі ў **Слонімскім** раённым цэнтры культуры, народнай творчасці і рамёстваў. Яго слоган мабілізуе на вялікія справы: "З Інтэрнэту выходзь і на вуліцу ідзі!" Пад такім дэвізам работнікі сельскіх клубных устаноў Слонімшчыны ладзяць забаўляльныя, спартыўныя, здаровыя выхадныя. Так што сумаваць не варта, доўга сядзець дома шкодна, а таму — на свежае паветра!

Яшчэ адна навіна з **Ліды**. Аўтар допісу — метадыст аддзела метадычнай і культурна-масавай работы Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Алена Габіс. Гаворка вядзецца пра тое, што Лідскі аддзел рамёстваў і традыцыйнай культуры прыняў удзел у рэалізацыі праекта "Традыцыйны строй" сацыяльна творчай установы развіцця беларускай музыкі і мастацтва "ЭтнаТрадыцыя" з Мінска. Сутнасць праекта ў стварэнні віртуальнай энцыклапедыі народных строяў Беларусі. Ліда прадставіла два строі гісторыка-этнагафічнага рэгіёна Панямоння, якія бытавалі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. *"Гэта вілейскі строй,* — распавядае аўтар, *— з арэолам распаўсюджвання на паўночным усходзе Гродзенскай і паўночным захадзе Мінскай абласцей, і навагрудскі строй, які ахапіў тэрыторыі Навагрудскага, Карэліцкага, Слонімскага і Лідскага раёнаў Гродзеншчыны".* Элементы адзення можна пабачыць буйным планам, пазнаёміцца з іх аўтэнтычнымі назвамі. І гэта таксама практычнае краязнаўства.

Беражыце здароўе, шаноўныя, і пішыце пра цікавае!

Сустрэнемся праз тыдзень.

Бясцэнны вопыт творцы

Ад "Дружбы" да "Маладзіц"

Воля нарадзілася ў вёсцы Баравікі Светлагорскага раёна. З дзяцінства яе прыцягваў свет музыкі і тэатра. Дзяўчынка паступіла і з поспехам скончыла Баравікоўскую музычную школу па класе акардэона. Асабліва радавалі вучаніцу ўрокі выкладчыцы Ірыны Стрыжэус. Вольга прымала актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці ў школе і ў мерапрыемствах Баравікоўскага СДК.

Стваральнік і кіраўнік ансамбля народнай песні "Маладзіцы" Надзея Аляксеенка з радасцю прыняла дзяўчынку ў склад калектыву, давярала ёй выконваць ролі пры інсцэніроўцы аўтэнтычных абрадаў. Мама дзівілася: "І ў каго ты ў нас удалася?" Хто ж яго ведае, адкуль тыя здольнасці бяруцца? Пра таленавітых дзяцей звычайна кажуць: "Гасподзь пацалаваў дзіцятка пры нараджэнні".

Вольга Пунтус.

Народны гурт "Маладзіцы".

Ансамбль "Дружба".

КАЛІ СНЯЦЦА ВАСІЛЬКІ

Пасля заканчэння школы Вольга паступіла ў Магілёўскі каледж культуры на аддзяленне народнай творчасці па спецыяльнасці "акампаніятар". Студэнцкае жыццё было напоўнена шчасцем спасціжэння свету музыкі, удасканалення сваіх вакальных магчымасцей і радасцю, з якой студэнтка ўдзельнічала ў справаздачных канцэртах, тэатралізаваных праграмах і іншых масавых мерапрыемствах.

Па размеркаванні працавала ў раённым Цэнтры культуры і ў музычнай школе канцэртмайстрам у Касцюковічах. Усё было добра, але клікала-цягнула да сябе родная старонка. Сумавала Вольга па малой радзіме, сніліся ёй родная вёска, бацькоўскі дом, васількі на жытнёвым полі. Таму і пераехала ў родныя Баравікі, дзе была прынятая ў мясцовы СДК мастацкім кіраўніком. З вялікім жаданнем Вольга Мікалаеўна прыступіла да сваіх абавязкаў, глыбей спасцігаючы сваю шматгранную прафесію.

ЧАЛАВЕК-СВЯТА

Работнік культуры ў вёсцы — гэта не толькі чалавек-свята, але і чалавек для зносін з дзецьмі, моладдзю, а асабліва на сяле — з людзьмі пажылога ўзросту. У гэтых гутарках і можна здабыць звесткі аб народных традыцыях, абрадах, песнях. Роля культработніка на сяле — гэта захаванне і прымнажэнне духоўных традыцый і культурнай спадчыны. З гэтай мэтай малады спецыяліст Вольга Пунтус стварае дзіцячы ансамбль песні "Дружба". Сёння юныя спевакі актыўна ўдзельнічаюць у культурным жыцці вёскі і Светлагорскага раёна, маюць дыпломы за ўдзел у раённых і абласных конкурсах.

У 2012 годзе Вольга Мікалаеўна прызначана загадчыкам Баравікоўскага СДК. Прыйшлося перадаць ансамбль "Дружба" маладому спецыялісту Марце Пішчала. Вядома, павышэнне па службе — справа радасная і ганаровая, але і адказнасці, клопатаў дадае нямерана. Набыты вопыт і атрыманыя веды дапамаглі маладой загадчыцы наладзіць працу. Нездарма ж Баравікоўскі СДК за 2020 год быў прызнаны пераможцам раённага спаборніцтва сярод сельскіх дамоў культуры.

НОВЫ ФАРМАТ

У сакавіку 2021 года на базе СДК праводзіўся абласны семінар кіраўнікоў метадычных службаў вобласці па тэме "Новыя формы — новы фармат. Крэатыўны падыход да арганізацыі вольнага часу розных катэгорый насельніцтва ўстановамі культуры Гомельскай вобласці".

На семінары СДК правёў паказ мадэляў "Касцюм як від мастацтва", інтэрактыўны флэшмоб "Новы фармат", прэзентаваў мультымедыйны праект "Феерверк ідэй".

За 2021 год у СДК якасна праведзена 325 мерапрыемстваў. Выхаванню грамадзянскасці і патрыятызму спрыялі святы "Вам прысвячаецца, салдаты Радзімы маёй", гадзіна памяці "Душы, апаленыя Афганістанам", мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Канстытуцыі і Дню герба і сцяга Рэспублікі Беларусь, вечар-рэквіем "Сцежкаю слёз і надзей", праект "7 дзён да Перамогі" і інш. Маральна-эстэтычнаму выхаванню спрыяюць ранішнікі, вечары, конкурсы, вечары адпачынку, тэатралізаваныя паказы.

ПАРТНЁРЫ

У раённым конкурсе "Вясковыя зарніцы — 21" атрыманы два дыпломы II і адзін — III ступені. Цэнтр культуры пры арганізацыі вольнага часу дзяцей супрацоўнічае з Баравікоўскай сярэдняй школай. Праводзяцца Калядкі, Масленіца. Супрацоўнічае СДК і з мясцовым праваслаўным храмам Вялікапакутніцы Варвары. Разам ладзяць гадзіны духоўных зносін.

Паспяваюць культработнікі надаць увагу і экалагічным акцыям, і спартыўна-масавым мерапрыемствам, праводзяць канцэрты на фермах, палявых станах, у маланаселеных вёсках. Дарэчы, у раённым аглядзе-конкурсе Баравікоўскі СДК за абслугоўванне маланаселеных вёсак удастоены дыплома II ступені.

БОЛЬШ ЗА 40 ДЫПЛОМАЎ

Асаблівы гонар сельскага дома культуры — ансамбль "Маладзіцы". У 1978-м гэты калектыў стварыла і нязменна кіравала ім да 2019 года Надзея Аляксеенка. У 1991-м ансамблю прысвоена найменне "народны". На сёння "Маладзіцы" — адзін з лепшых калектываў Светлагоршчыны, удзельнік рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх і раённых святочных мерапрыемстваў. У творчай скарбонцы ансамбля больш за сорак дыпломаў, ганаровых грамат і падзячных лістоў. Абрад "Хрэсьбіны ў Баравіках" здымала рэспубліканскае тэлебачанне. Калектыў займаецца вялікай канцэртнай дзейнасцю, бярэ ўдзел ва ўсіх раённых і сельскіх мерапрыемствах: Дзень горада Светлагорска, народныя гулянні на Масленіцу, святы вёсак раёна; удзельнічае ў абласных і рэспубліканскіх кірмашах. Часта "Маладзіц" запрашаюць правесці вясельны беларускі абрад.

Спадарыня Вольга курыруе працу ансамбля, сябрам якога з'яўляецца. Вось што яна распавяла: "Час няўмольны, многіх удзельнікаў ансамбля ўжо няма з намі, але іх бясцэнны вопыт застаўся ў калектыве. Дагэтуль салісткамі ансамбля з'яўляюцца Валянціна Багдановіч і Надзея Аляксеенка. Я лічу Надзею Іосіфаўну кіраўніком, бо заўсёды звяртаюся да яе па каштоўную параду і па дапамогу".

СТЫЛІЗАВАНЫ ФАЛЬКЛОР

Сёння ў ансамбль прыходзяць людзі маладога пакалення, абнаўляецца і выкарыстоўваецца ў дар пакінуты песенны рэпертуар. Моладзь з цікавасцю далучаецца да народнай песні, традыцый і абрадаў. Ансамбль не з'яўляецца аўтэнтычным, калектыў выкарыстоўвае ў сваім рэпертуары стылізаваны фальклор, а таксама народныя песні ў сучаснай апрацоўцы і творы сучасных кампазітараў. Спявачкі аддаюць перавагу песням лірычным, душэўным, меладычным, якія не пакідаюць абыякавымі душы і сэрцы гледачоў. Цяпер у складзе ансамбля 15 спявачак ва ўзросце ад 21 да 60 гадоў. І ў кожнай — вялікае жаданне спяваць і праслаўляць родны край.

Галіна КАПЕЦКАЯ,
Светлагорск

Фотаздымкі з архіва Вольгі Пунтус

Не проста сведка...

Сутнасць бібліятэчнай выставы

Беларускі народ ніколі не быў простым сведкам і сузіральнікам сусветнага гістарычнага працэсу. Застаючыся неад'емнай часткай чалавецтва і еўрапейскай цывілізацыі, ён заўсёды з'яўляўся актыўным суб'ектам тых гістарычных падзей, якія так ці інакш закраналі яго самога, блізкіх і аддаленых суседзяў, усё чалавецтва. Вось чаму гістарычны вопыт і памяць нашага народа — магутны рэсурс, неабходны для асэнсавання і пабудовы нашай будучыні. Таму 2022 год абвешчаны Годам гістарычнай памяці, які Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Яўхіма Карскага пачала з унікальнага выставачнага праекта "Гістарычная памяць — светлая будучыня".

Падчас выстаў.
Фота з бібліятэчнага архіва.

У вазе чытачоў прадстаўлена звыш 200 экзэмпляраў кніг, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб славутых мясцінах, грамадскіх дзеячах і важных падзеях гістарычнага мінулага Беларусі. Экспазіцыя дазваляе паглыбіць свае веды ў вобласці культуры і гісторыі нашай краіны, звярнуўшы ўвагу на займальныя і раней невядомыя факты. Шматвекавая гісторыя беларускага народа сведчыць аб тым, як высока мы цэнім мір і дабрабыт на роднай зямлі, як беражліва ставімся да спадчыны мінулых пакаленняў і ўпэўнена будуем сучаснасць і будучыню дзяржавы.

ДЫЯЛОГ СТАГОДДЗЯЎ

Выставачны праект складаецца з некалькіх раздзелаў. Першы з іх — "Беларусь у дыялогу стагоддзяў" — змяшчае энцыклапедычныя, даведачныя і юрыдычныя выданні аб грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці, гісторыі і сучаснасці Рэспублікі Беларусь, аб асаблівасцях фарміравання і развіцця беларускай дзяржавы і дзяржаўнай улады Беларусі, яе сімвалах (гімне, сцягу, гербе суверэннай Беларусі), законах і нноваўвядзеннях у іх і г.д. Кнігі дадзенага раздзела адлюстроўваюць пераемнасць традыцый беларускага народа ад мінулага да сучаснасці, паказваюць гісторыю станаўлення самых вядомых беларускіх машынабудаўнічых тэхнік новага пакалення і інавацыйных распрацовак сучасных беларускіх канструктараў і брэндаў нацыянальнай эканомікі: АМКАДОР, БЕЛАЗ, МАЗ, МТЗ, БЕЛКАМУНМАШ, МЗКТ (Volat), БЕЛДЖЫ (Geely) і інш.

На Год гістарычнай памяці даводзіцца шмат знакавых дат, якія асвятляюцца на паліцах выставачнага праекта: 1160-годдзе з дня заснавання Полацка, 955-годдзе з дня заснавання Мінска, 100-годдзе з дня заснавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, 210-годдзе з часу пачатку і заканчэння Айчыннай вайны 1812 г. і інш.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны — незабыўная і невычэрпная частка нашай гісторыі. Яна прымушае помніць, хваляванца і думаць аб несмяротным подзвігу салдат і тых фактарах, якія аказаліся вырашальнымі для Вялікай Перамогі, якой сёлета спаўняецца 77 гадоў. Праз гістарычную, дакументальную, навукова-папулярную і мемуарную літаратуру, кнігі, фотадакументы, энцыклапедыі, даведнікі па ваеннай гісторыі і ілюстрацыі, прадстаўленыя на выставе, мы акцэнтуем увагу чытачоў на нашай гісторыі, незабыўных трагічных момантах суровага часу, калі на роднай зямлі палаў агонь вайны. На дакладных гістарычных фактах і матэрыялах асноўныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны разглядаюцца ў выданнях, якія дэманструюцца на выставе.

МЫ ПРАПАНУЕМ ВАМ МАРШРУТ

У раздзеле "Славутыя мясціны Беларусі" прадстаўлены навукова-папулярныя выданні, якія распавядаюць аб гісторыка-культурнай спадчыне Зямлі пад белымі крыламі: аб лепшых турыстычных маршрутах па знакамітых мясцінах, храмах, музеях, аб дойлідстве і прыродных з'явах нашай краіны, вартых наведвання і абмеркавання. Сярод іх: Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Каложская царква, Нясвіжскі і Мірскі замкі, Полацкі Сафійскі сабор, спартыўны комплекс "Мінск-Арэна", Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, Брэсцкая крэпасць, "Лінія Сталіна", Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Браслаўскія азёры, Белавежская пушча і інш.

На нашай зямлі ўсё дыхае гармоніяй: сярэднявечныя замкі, маленькія сельскія цэрквы, старажытныя язычніцкія капішчы, гарадзішчы, лясы, якія захавалі прыгажосць першароднай прыроды, празрыстыя азёры, выдатныя мясціны Беларусі з гістарычнай і архітэктурнай значымасцю: Полацк, Нясвіж, Мір, Тураў, Аўгустоўскі канал і інш.

Акрамя таго, у раздзеле прадстаўлены кнігі, прысвечаныя гарадам, якім у Год гістарычнай памяці па першай згадцы ў летапісе спаўняецца з дня засвае́ння: 955 гадоў — Мінску — сталіцы і найбольшаму гораду Беларусі (першая згадка — у летапісе "Аповесць мінулых часоў" пад 1067 г.):, 1160 гадоў — Полацку — найстаражытнейшаму гораду Беларусі і Усходняй Еўропы, калысцы беларускай дзяржаўнасці, культуры і духоўнасці (першае пісьмовая згадка патрыярха беларускіх гарадоў адносіцца да 862 года ("Аповесць мінулых часоў").

15 верасня 2022 года галоўная бібліятэка нашай краіны адзначыць юбілей з дня заснавання. 100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўнесена ў спіс памятных дат ЮНЕСКА па рашэнні 41-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА 2021 г. Уваходжанне ў каляндар ЮНЕСКА пацвярджае значны ўклад бібліятэкі ў развіццё сусветнай культуры і папулярызацыю дзейнасці арганізацыі. Такое супрацоўніцтва спрыяе інтэграцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў сусветную бібліятэчную супольнасць і дазваляе ўзбагаціць дзейнасць па захаванні і выкарыстанні нацыянальнага культурнага здабытку. Усяго ў каляндар мерапрыемстваў ЮНЕСКА на наступныя два гады ўвайшло 67 найбольш важных падзей з усяго свету.

І СЛОВА ПРА КУЛЬТУРУ

Раздзел "Каларыт беларускай культуры" дэманструе рознагаліновую літаратуру, прысвечаную нацыянальнай самабытнасці Рэспублікі Беларусь, яе багатай архітэктурнай і культурнай спадчыне, народным традыцыям, абрадам і рамёствам. Сярод найбольш каларытных сімвалаў нашай краіны можна згадаць беларускі арнамент, габелен, ручнік, нацыянальны касцюм, слуцкія паясы, беларускую кухню, бусла, зубра, лён, васілёк і знакамітую беларускую бульбу, інфармацыю аб якіх можна знайсці ў шматлікіх выданнях.

Для прыхільнікаў беларускага мастацтва на выставе падрыхтаваны кнігі пра выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, архітэктуру і скульптуру, музыку, дызайн, тэатр і кіно.

СУПРАЦА З ВЫДАВЕЦТВАМІ

Выставачны праект "Гістарычная памяць — светлая будучыня" змяшчае і літаратуру апошніх гадоў розных выдавецтваў, з якімі супрацоўнічае бібліятэка, — "БЕЛТА", "Беларусь", "Адукацыя і выхаванне", "Беларуская навука", "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", "Звязда", "Вышэйшая школа", "Харвест", "Мастацкая літаратура". У шэрагу кніг знаходзяцца комплексныя звесткі пра нашу краіну і яе дасягненні ў розных сферах дзейнасці.

ВЫБІТНЫЯ АСОБЫ

Апошні раздзел, "Знакавыя постаці Беларусі", знаёміць чытачоў з таленавітымі і выбітнымі людзьмі, гістарычнымі дзеячамі і пісьменнікамі, мастакамі і кампазітарамі, касманаўтамі і выдатнымі спартсменамі, якія так ці інакш паўплывалі на станаўленне роднай краіны, мовы, літаратуры і культуры. Гэта Францыск Скарына, Максім Багдановіч, Яўхім Карскі, Пётр Машэраў, Міхаіл Савіцкі, Мікалай Яроменка, Ігар Лучанок, Алег Навіцкі, Пётр Клімук, Алена Бялова, Аляксандр Мядзведзь.

У яскрава афармленых кнігах сабраны ўспаміны, інтэрв'ю, біяграфічныя звесткі, дакументальна-паэтычныя мемуары, дакументальныя аповесці, нарысы, эсэ, артыкулы, замалёўкі і эцюды, з дапамогай якіх можна адсачыць дзіўны жыццёвы шлях таленавітых людзей, чарадзеяў сцэны, грамадзян-патрыётаў, актыўных грамадскіх дзеячаў і нястомных вандроўнікаў. Згаданая літаратура займае пачэснае месца побач з іншымі выданнямі папулярнай серыі "Жыццё знакамітых людзей Беларусі".

Цэлая галерэя знаёмых вобразаў паўстае ў выданнях серый "Славутыя мастакі з Беларусі", "100 выдатных дзеячаў беларускай культуры" пра Ефрасінню Полацкую, Кірылу Тураўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Івана Шамякіна, Янку Маўра, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Івана Мележа, Кузьму Чорнага, Міхаіла Фінберга, Леаніда Шчамялёва, Расціслава Янкоўскага, Міхаіла Высоцкага, Пятра Клімука і іншых.

Асобнае месца адведзена пісьменнікам-юбілярам 2022 года — Янку Купалу (140 гадоў), Якубу Коласу (140 гадоў) і Максіму Танку (110 гадоў).

ЗАМЕСТ ЗАКАНЧЭННЯ

Прадстаўленыя на выставачным праекце "Гістарычная памяць — светлая будучыня" кнігі пашыраюць далягляд і дазваляюць даведацца пра тое, пра што чытачы нават не здагадваліся. Такія кнігі трэба чытаць з вялікай увагай, са шчырымі пачуццямі і з верай, каб быць упэўненым у тым, што ў нашай старонкі не толькі гераічнае мінулае, але і перспектыўная будучыня.

Я наўмысна не называю ў тэксце канкрэтныя выданні (іх вельмі шмат!), а запрашаю ўсіх ахвотных азнаёміцца з імі ў экспазіцыйнай зале галоўнага корпуса найстарэйшай бібліятэкі Беларусі.

Валянціна МЕДЗЕР,
вядучы бібліятэкар аддзела абанемента Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі

Калі гадоў 30 таму ў Беларусі масава пачало адраджацца мастацтва выцінанкі, адным з першых, хто падхапіў хвалю і з цягам часу стаў прызнаным майстрам у гэтай справе, быў Станіслаў Муліца з Гродна. Летась выцінанка атрымала статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, і заслуга Станіслава Вітольдавіча ў тым таксама ёсць — як аднаго з афіцыйна прызнаных носьбітаў традыцыі на Гродзеншчыне. На пачатку лютага ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага адкрылася вялікая і самая маштабная за ўсе часы дзейнасці майстра выстава "Чароўны свет выцінанкі" — на ёй больш за 200 твораў.

Статус чароўнай выцінанкі

Надзея КУДРЭЙКА

Абласная навуковая бібліятэка імя Яўхіма Карскага — самая вялікая ў Гродзенскай вобласці і першая публічная бібліятэка на Беларусі: рашэнне аб яе адкрыцці было прынята яшчэ ў 1830 годзе. Месціцца яна ў гістарычным цэнтры горада ў чатырох будынках, і ў адным з іх — у аддзеле мастацтва, — у вялікай прыгожай зале з высокімі столямі і арыгінальнымі вокнамі 3 лютага адкрылася персанальная выстава Станіслава Муліцы. Наведнікаў ужо нямала. Як зазначае вядучы бібліятэкар аддзела мастацтваў Лілія Хадароўская, нават простыя мінакі, калі з вуліцы бачаць вокны, упрыгожаныя чароўнымі ажурнымі фіранкамі Станіслава Муліцы, адразу цягнуцца на выставу. Адкрыццё экспазіцыі сабрала шмат зацікаўленых людзей, прэсу, тэлебачанне, і нават мясцовых гідаў і прадстаўнікоў турыстычных арганізацый, якія сочаць за падзеямі і мерапрыемствамі ў бібліятэцы, вартымі ўвагі турыстаў. Сам майстар не толькі расказаў многа цікавага, але і правёў майстар-клас, у якім прысутныя з захвотай паўдзельнічалі. А такая вялікая выстава, дзе выцінанкі — да самай столі, на двухбаковых вітрынах, на стэндах, — пакідае незабыўнае ўражанне.

Дарэчы, бібліятэка імя Карскага заўсёды, калі ладзіць якое мерапрыемства, не забываецца і на сваю галоўную, бібліятэчную функцыю: з багатага кнігасховішча рыхтуецца тэматычная кніжная выстава. І гэтым разам склалася даволі значная падборка літаратуры, каля 20 выданняў, па тэме беларускіх народных рамёстваў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у кожным з якіх пэўныя старонкі прысвечаны дзейнасці майстра Станіслава Муліцы. Як расказвае Лілія Хадароўская, такія выданні ў бібліятэцы карыстаюцца нязменным попытам у чытачоў, а сярод іншага ў бібліятэцы захавалася нават першае выданне, дзе было напісана пра Станіслава Муліцу: "Выцінанка Гродзеншчыны", 1997 год, падрыхтаванае Гродзенскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці.

«На досвітку» (фіранка).

«На Купалле сонца грае».

Гэтым разам выстаўлены толькі беларускія выданні, а насамрэч іх значна больш — бо пра Станіслава Муліцу многа напісана і ў польскіх і літоўскіх выданнях па выцінанцы, якая ў нашых суседзяў таксама папулярная і мае багатыя гістарычныя традыцыі. У той жа Польшчы захавалася значна больш сведчанняў пра выцінанку, скажам, стагадовай даўніны, і там майстры цяпер часта паўтараюць ранейшыя ўзоры, ствараюць выцінанкі паводле традыцый, што былі ўласцівыя таму ці іншаму этнаграфічнаму рэгіёну. А вось Беларусь у гэтым плане не можа пахваліцца багаццем старадаўніх выцінанак, што захаваліся ў матэрыяльным выглядзе. І сучасная беларуская школа, якая на новым этапе пачала фарміравацца недзе ў 80-х гадах, адзначаецца выразнай індывідуальнасцю, знакамітыя майстры — гэта аўтары ў поўным сэнсе слова, чые творы, згадваючы тую ж Лізавету Чырвонцаву з Маладзечна, карыстаюцца папулярнасцю і ў сучасным дызайне. Але, канешне, у самых базавых сваіх рэчах беларускія майстры, як і Станіслаў Муліца, абапіраюцца на традыцыі і прынцыпы фальклорных вобразаў і сімвалаў.

Станіслаў Вітольдавіч за амаль 30 гадоў стварыў больш за тысячу значных твораў, якія разышліся па розных краінах свету і якія знаходзяцца не толькі ў прыватных калекцыях, але і ў фондах вялікіх музеяў: выцінанкі Муліцы ёсць і ў гісторыка-археалагічным музеі і Музеі гісторыі рэлігіі ў Гродне, у Музеі старадаўняй беларускай культуры Акадэміі навук Беларусі, у Музеі сучаснага мастацтва ў Дрэздэне, у Музеі этнаграфіі ў Варшаве, у Кракаўскім музеі і г. д. Калісьці ён стварыў цэлую серыю работ па архітэктуры Гродна, па гістарычных падзеях, адлюстраваў нямала сцэнак з жыцця, з народных свят. Лепшыя работы разышліся па свеце, а на выставе "Чароўны свет выцінанкі" — тое, што зроблена ў асноўным за апошнія гады, натхнёнае тэмай прыроды, фларыстыкай: "Хіба можна знайсці нешта прыгажэйшае!" — кажа Станіслаў Муліца.

Кніга па выцінанцы калісьці патрапіла яму ў рукі выпадкова — было гэта ў 1993 годзе. Паспрабаваў сам выразаць — і захапіўся. Тады на старых вясковых фота 40—50-х гадоў мінулага стагоддзя ўбачыў выцінанку нават на кадрах з пахаванняў. І даследчыкі ўжо сапраўды вывучаюць выцінанкі не толькі для ўпрыгожвання хат, печак, вокнаў, але і іх выкарыстанне ў сакральных мэтах: і труну нябожчыка імі аздаблялі, і калыску дзіцяці, і ікону...

На самым пачатку Станіслава Муліцу падтрымаў знакаміты майстар выцінанкі з Гродна Аляксандр Аўчыннікаў. Калі хваля адраджэння майстэрства толькі пачыналася — а гэта 80-я гады, — у Беларусі ўжо працавала нямала знакамітых майстроў-мужчын, хаця традыцыйна занятак лічыўся жаночым. Можна згадаць хоць бы запісанага ва ўсе энцыклапедыі майстра Вячаслава Дубінку. Вось і Станіслаў Муліца трапіў у лік нешматлікіх мужчын у справе, якая ізноў славіцца ў асноўным майстрыхамі-жанчынамі. На гэты конт сам Станіслаў Вітольдавіч жартуе: "Некаторыя смяюцца, што мне, мабыць, рукі нейкай жанчыны прышылі, бо ўсё так тонка атрымліваецца".

І хоць выцінанкай Станіслаў Муліца захапіўся выпадкова, і як сам адзначае — ніякай мастацкай адукацыі не мае, але ўсё ж творчасць і талент мастака ў ім невыпадковыя, бо ўсё жыццё ён адпрацаваў у галіне культуры, усё жыццё спрыяў яе развіццю. У юнацтве пачынаў як мастацкі кіраўнік у сельскім Доме культуры ў сваёй роднай вёсцы Дайліды Іўеўскага раёна. Потым скончыў культасветвучылішча ў Гродне, інстытут у Ленінградзе — там, дарэчы, пісаў дыпломную работу ў музеі этнаграфіі. Як цяпер кажа: "Відавочна, да гэтай тэмы мяне цягнула заўсёды. У Ленінградзе цікавы вопыт быў — вось так паходзіш па Эрмітажы, па Рускім музеі, а потым пераключаешся на этнаграфію, і ў цябе проста ракурс успрымання мастацтва змяняецца". У галіне культуры Станіслаў Вітольдавіч зрабіў, можна сказаць, значную кар'еру — зараз ужо на пенсіі, але ў свой час ён быў і дырэктарам Палаца культуры хімікаў. Лішне казаць, што як дырэктар такой вялікай і значнай установы ён паспрыяў самым розным мастацтвам і майстэрствам, але ж і як майстар народных рамёстваў таксама выявіўся вялікім энтузіястам і арганізатарам у Гродне. Менавіта Станіслаў Муліца калісьці прыдумаў і пачаў праводзіць вялікі і вельмі папулярны ў горадзе кірмаш майстроў народнай творчасці "Казюкі" — і вось ужо 21 год традыцыя кірмашу не спыняецца. Ён расшукваў майстроў, выцягваў іх, так бы мовіць, на шырокі публічны свет, паказваў іх унікальныя творы. З таго, пра што зараз згадвае з гонарам, і тое, як "адшукаў" чатырох бабулек — сёстраў Сарасек, якія выраблялі адметныя велікодныя ўпрыгожванні, так званыя "Гарадзенскія вербы". У выніку традыцыя не проста прагучала на ўсю краіну, але і атрымала статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Цяпер ужо як арганізатар Станіслаў Вітольдавіч ад актыўнага жыцця адышоў, а як майстар кажа, што натхненне не заўсёды ж бывае: калі яго няма, дык нічога і не стварае. Але адзначае, што ў сувязі з леташнім наданнем выцінанцы статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці да яго пачалі звяртацца часцей. То так і натхненне з'явілася, і нейкія творы ён зрабіў ужо спецыяльна для выставы ў бібліятэцы імя Карскага. Вялікія выразаныя фіранкі, якімі ў бібліятэцы зараз упрыгожаны вокны — якраз новае захапленне майстра. Дарэчы, факт прызнання ў нас выцінанкі на дзяржаўным узроўні ён лічыць вельмі каштоўным: "Мы ж паміж сабой стасуемся з майстрамі па ўсім свеце. Дык нам нават зайздросцяць. Калі французскаму майстру расказаў, што вось такі статус у нас, дык ён быў у захапленні, і пашкадаваў, што ў Францыі не так. І літоўцы-майстры нам зайздросцяць, што ў іх няма такога статусу, а ў нас ужо ёсць. А ў Літве ў выцінанкі багатыя традыцыі, якія, зразумела, недзе перасякаюцца і з беларускімі".

Выстава ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы прадоўжыцца да сярэдзіны сакавіка, а майстар думае ўжо пра наступную выстаўку і пра тое новае, што да яе зробіць. Да Вялікадня ў Гродне ў абласным метадычным цэнтры народнай творчасці рыхтуецца вялікі праект пісанак, аклеянак, і Станіслаў Муліца для яе і новыя фіранкі рыхтуе, і задумвае вялізнае пано — ад падлогі да столі. Мабыць, таксама атрымаецца чароўна. Калі талент творцы сумяшчаецца з такім мастацтвам, як выцінанка, заўсёды атрымліваецца менавіта што чароўна.

Фота з уласнага архіва майстра

18 лютага споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння народнага мастака БССР і СССР, Героя Беларусі Міхаіла Андрэевіча САВІЦКАГА

Міхаіл Савіцкі. 1974.

“Зарыты в нашу память на века // И даты, и события, и лица, // А память — как колодец глубока, // Попробуй заглянуть: наверняка // Лицо — и то — неясно отразится…” Мне здаецца, што гэтыя пранізлівыя радкі Уладзіміра Высоцкага дакладна праяўляюць кантэкст той драматычнай старонкі жыцця майго сённяшняга героя аповеду, які пасля 250 сутак гераічнай абароны Севастопаля, 4 ліпеня 1942-га, параненым трапіў у палон і прабыў два гады і дзевяць месяцаў у фашысцкіх лагерах смерці. І — насуперак усяму — выжыў! Мабыць, Бог яго захаваў. Захаваў для краіны, для мастацтва, для родных, для свету, для нас, яго нашчадкаў...

Раны на сэрцы, што не загойваюцца ніколі...

PER ASPERA AD ASTRA...

...З Міхаілам Андрэевічам я блізка пазнаёміўся ў канцы 1960-х, калі ён мяне, маладога мастацтвазнаўцу, запрасіў на кубачак гарбаты ў сваю майстэрню, якая знаходзілася ў доме на тэрыторыі мастацка-вытворчага камбіната па вуліцы Някрасава, 7. Мастак якраз заканчваў карціну, прысвечаную аршанскім партызанам-заслонаўцам. З таго часу мы сталі рэгулярна сустракацца...

Першае вялікае інтэрв’ю ў яго я ўзяў у 1968 годзе для часопіса “Нёман” (№12). Тады Міхаіл Андрэевіч яшчэ не меў ніякіх ганаровых званняў. 46-гадовы жывапісец нават не быў “заслужаным”! Але мне падалося, што на той час гэта яго мала хвалявала, хаця ён быў уладальнікам медаля “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.”, сярэбранага медаля Акадэміі мастацтваў СССР і ордэна “Знак Пашаны”. Для мастака было больш важна ведаць, як глядач успрымаў створаныя ім незадоўга да гэтага карціны “Партызанская мадонна” і “Віцебскія вароты”, якія ў прэсе ўжо шырока абмяркоўваліся.

Лёс Савіцкага — лёс унікальны. На розных этапах жыцця ён спазнаў, што такое зло, чалавечая несправядлівасць, здрадніцтва, зайздрасць, горыч няўдач, хваробы, жорсткія паклёпы некаторых кулуарных крытыкаў, асабістыя душэўныя перажыванні і пакуты. Але — выстаяў. Выстаяў, бо не драбніў сябе і не блытаўся па розных “модных” мастакоўскіх дарогах. Зрэшты, такі тыповы лёс большасці выдатных майстроў, і Савіцкі ў гэтым шэрагу не быў выключэннем. Тым не менш ён спазнаў і прыжыццёвую славу, і атрымаў самыя высокія ганаровыя званні, прэміі, узнагароды, і любоў мільёнаў гледачоў, і міжнароднае прызнанне сваіх творчых дасягненняў. Словам, ён дастойна прайшоў per aspera ad astra...

М.Савіцкі. Вязень №32815. Аўтапартрэт.

Пасля смерці Майстра нам у спадчыну застаўся бліскучы жывапісны эпас цэлай эпохі. Урэшце, ён і сам як асоба — цэлая эпоха. Каб яшчэ раз у гэтым упэўніцца, трэба паглядзець выставу “Міхаіл Савіцкі. Да 100-годдзя з дня нараджэння”, якая ўчора разам з гашэннем канверта з маркай да юбілею мастака адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі, арганізаваная сумесна з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Мастацкай галерэяй Міхаіла Савіцкага. Дарэчы, у гэтай галерэі сёння прадстаўлена экспазіцыя твораў яго шматлікіх вучняў — выхаванцаў Творчых акадэмічных майстэрань Міністэрства культуры Беларусі, якія ўзначальваў Міхаіл Андрэевіч з 1981 года і да скону свайго жыцця.

Ніхто не стане спрачацца, нават апаненты, што Савіцкі, пачынаючы з 1960-х, аб’ектыўна быў бясспрэчным лідарам у беларускай выяўленчай культуры, і гэта лідарства ён на працягу наступных амаль пяці дзесяцігоддзяў мала каму саступаў. Такі факт. Таму што ён сваёй творчасцю здолеў узвесці сабе помнік нерукатворны і ўвайсці ў лік класікаў выяўленчага мастацтва другой паловы XX стагоддзя.

Сёння я хачу расказаць, уласна, не пра карціны Савіцкага, пра якія ўжо шмат сказана-пераказана ў СМІ, манаграфіях, альбомах, дакументальных фільмах. Я раскажу пра самую трагічную старонку яго біяграфіі, якая яшчэ недастаткова вядомая сучасным чытачам, асабліва маладым. Пра тое, як пасля палону склаўся лёс намесніка камандзіра 793-га асобнага батальёна сувязі 345-йстралковайдывізіі Паўночна-Каўказскага фронту Міхаіла Савіцкага — аднаго з апошніх абаронцаў Севастопаля. Пра сам баявы шлях маладога салдата Чырвонай арміі, пачынаючы з 22 чэрвеня 1941 года, і пра яго ўдзел у жорсткіх баях за гэтую чарнаморскую цвярдыню я расказваў на старонках «К» у 2021 годзе (№№ 8, 9, 10).

З ПАЛОНУ — У ПЕКЛА ЛАГЕРА

Але цяпер — пра палон. Севастопаль. Камяністае ўзбярэжжа Херсанескага мыса — самай заходняй кропкі Крымскага паўвострава. Гарачае лета 1942-га. Прыціснутыя да мора маракі і чырвонаармейцы, сярод якіх быў Міхаіл, чацвёра сутак, практычна без харчоў і пітной вады, стрымлівалі націск ворага, пакуль не скончыліся патроны.

Падрабязныя дэталі свайго паланення Савіцкі не помніў. Апошняе, што бачыў, — фантан успучанай зямлі і каменнага пылу. Гэтым выбухам ён быў кантужаны, але здолеў вярнуцца на бок жыцця, не пераходзячы мяжу небыцця. Калі ачуняў, над ім стаяў нямецкі аўтаматчык з закасанымі па локаць рукавамі...

Палонных пасадзілі на камяні ля берага. Здавалася, звінела цішыня. Вось такі аксюмаран. Праз паўгадзіны эсэсаўцы сталі ўсіх збіраць і строіць па дзесяць чалавек у калону. У першую чаргу выявілі палітработнікаў і яўрэяў і тут жа на месцы іх расстралялі кароткімі аўтаматнымі чэргамі.

Увесь бераг быў заціснуты танкамі і танкеткамі. Палонных павялі разбітай дарогай у бок Камышовай бухты. Калі хто падаў ад знямогі, фашысты яго дабівалі. Спыніліся ў Бахчысараі. Тут жа быў перасыльны лагер, куды ваеннапалонных запакавалі так, што яблыку не было дзе ўпасці ў самым прамым сэнсе. Людзі ў страшэннай цеснаце баракаў пакутавалі трое сутак. Потым рушылі ў сімферопальскі перасыльны лагер, у так званы бульбяны гарадок. З трох тысяч ваеннапалонных да месца прызначэння дайшла прыкладна палова.

Праз нейкі час вязняў чакаў горад Мікалаеў. Гналі, як скаціну, па пыльных дарогах, амаль без ежы і вады. За двое сутак шляху некалькі дзясяткаў чалавек не змаглі перанесці гэты пякельны этап. Загінулі. Астатніх прывялі на вялікую плошчу, загароджаную калючым дротам. Гэта быў лагер з вартавымі вежамі і кулямётамі на тэрыторыі пасёлка, недалёка ад суднабудаўнічага завода.

Вязняў кінулі прама на брудную падлогу. У кожным пакоі памерам 15-16 квадратных метраў даводзілася спаць у тры пагібелі, бо туды набівалі да 40 чалавек. Кармілі раз на дзень баландай з бульбяных адкідаў. У суткі выдавалі 200 грам гаркаватага хлебнага эрзацу: шалупінне, лісце сланечніку, апілкі. У многіх не было кацялкоў і ежу бралі проста ў пілоткі. З вязняў пастаянна здзекаваліся, зневажалі, жорстка збівалі прыкладамі... Спадзявацца на выратаванне практычна не выпадала, і дзе ў сапраўднасці знаходзіўся фронт — ніхто не ведаў...

ГРУПА СУПРАЦІЎЛЕННЯ ДЗЕЙНІЧАЕ

Але тут прыйшоў загад: усіх адносна здаровых ваеннапалонных накіраваць па этапе ў фашысцкую Германію. Трэцяму рэйху да зарэзу патрабавалася бясплатная рабочая сіла. І вось Германія. Зямля Паўночны Рэйн-Вестфалія. Горад Штукенброк. Стацыянарны лагер Форэльркруг-Зенэ. У гітлераўскіх рэестрах ён быў пазначаны як Шталаг — 326 (VI-K) для рускіх ваеннапалонных. Тэрмін “шталаг” расшыфроўваецца як стацыянарны лагер, прызначаны для ўтрымання пад вартай палонных “ніжніх чыноў” працаўніка. У адрозненне ад канцлагераў і гета, усе шталагі кіраваліся вермахтам, а не СС. Але і тут для вязняў былі неймаверна цяжкія ўмовы. Гэты шталаг быў адначасова і базавым, і перасыльным. І так здарылася, што праз тры тыдні Савіцкага з невялікай групай найбольш моцных таварышаў накіравалі ў так званы выпраўленча-працоўны лагер горада Дзюсельдорфа на вагонабудаўнічы завод фірмы Zanf, што належала СС.

М. Савіцкі: “Наша заводская каманда налічвала дзевяноста чалавек, і ў ёй дастаткова лёгка знайшліся тыя, хто мог давяраць адзін аднаму. Мяне пасля невялікага навучання прызначылі ў брыгаду электразваршчыкаў. Вучылі, як варыць трывалае шво. Але з гэтага можна было атрымаць і, так бы мовіць, зваротны ўрок: пры якіх умовах шво можа атрымацца нетрывалым і ненадзейным. Гэта было галоўнай умовай для пачатку дыверсійнай работы. Паступова скалочвалася група супраціўлення з кіруючым цэнтрам з чатырох чалавек. Кіраўніком усёй нашай дыверсійнай дзейнасці стаў Георгій Іванавіч Карнілаў. Забягаючы наперад, скажу, што пасля вайны ён мяне адшукаў: у часопісе “Огонек” убачыў рэпрадукцыю маёй карціны. Падчас першай жа нашай сустрэчы ўгаварыў, дакладней “прымусіў” мяне ўзяцца за працу над цыклам палотнаў, якія потым атрымалі назву “Лічбы на сэрцы”. А тады на заводзе ён займаў месца нібыта непрыкметнае — працаваў простым зваршчыкам у электрацэху. Але сярод вязняў карыстаўся вялізным аўтарытэтам як чалавек смелы ды рашучы, гатовы пайсці на рызыку. Былы камісар партызанскага атрада імя Сталіна ў Крыме, ён трапіў у палон у раёне Керчанскіх катакомбаў прыкладна ў той жа час, што і я”.

Міхаіл хутка засвоіў усю тэхналогію вагоннай вытворчасці, навучыўся рабіць не толькі трывалыя швы, але і зварваць іх так, каб яны не адразу распаўзаліся, а толькі праз нейкі час, калі вагоны былі ўжо ў дарозе. Зразумела, ён быў не адзін. На-

ват у такіх нялёгкіх умовах патрыёты шукалі любыя магчымасці, каб нанесці ворагу шкоду. Да дыверсійнай дзейнасці далучалася ўсё большая колькасць рабочых. У выніку сабатажу сотні вагонаў вярталіся на завод для чарговага рамонту.

ДАНОС ПРАВАКАТАРА

Калі вялізны двор завода запоўнілі скасабочаныя вагоны, якія не вытрымлівалі і аднаго перагону, удзел вязняў у сабатажы мог стаць зусім зразумелым. Каб не спакушаць лёс, вырашылі паступова рыхтаваць пабег з лагера. Але для гэтага трэба было як след падрыхтавацца і паспрабаваць арганізаваць яўкі ў горадзе, дзе маглі б адседжвацца ўцекачы. Задача архіскладаная, але трэба было яе неяк вырашаць.

М.Савіцкі: "Час ішоў... І пакуль мы ў гэтым кірунку кумекалі, у мяне з'явіўся яшчэ адзін від дзейнасці, які нібы адносіўся да мастацтва, гэта дазволіла для ўсёй нашай суполкі здабываць тую-сюю ежу і цыгарэты. Бо рацыён складаўся з чарпака баланды, і мы апухалі ад голаду. Я навучыўся рабіць пярсцёнкі са звышцвёрдай хроманікелевай сталі... Цяпер проста не ўяўляю, як гэта можна было выканаць без спецыяльных інструментаў і лупы... Але сваім шэдэўрам тае пары я лічу два заручальныя пярсцёнкі. Паверхню кожнага — пры шырыні абадкоў у два і тры міліметры — я апрацаваў мікраскапічнымі, але вельмі дакладнымі шасцігранникамі, а таму кольцы зіхацелі так, быццам аздобленыя алмазамі. Не паверыш, у маіх пярсцёнкаў нават з'явіўся пэўны стыль. На іх пайшла своеасаблівая мода сярод вольнанаёмных рабочых, якія і былі асноўнымі заказчыкамі..."

Ювелірная практыка абарвалася імкліва. З-за правакатара, які з'явіўся ў лагеры неяк ціха ды непрыкметна, групу сабатажнікаў павінны былі вось-вось накрыць. Адзін з антыфашыстаў, які спаў побач з ім на нарах, на свой страх і рызыку выкраў у правакатара данос з пералікам некаторых прозвішчаў патрыётаў. Там былі і імёны Карнілава ды Савіцкага. Праўда, пад пытаннем. Значыць, не сёння дык заўтра пад каўпаком у нацыстаў апынецца ўся група. Выйсце адно — бегчы не марудзячы.

ПАБЕГ "СЯМ'І"

На рызыкоўны пабег пагадзіліся толькі трое: Міхаіл Савіцкі, Мікалай Карнілаў і Марыя Аляксандрава з Растова-на-Доне, гордая і сімпатычная саракагадовая жанчына, настаўніца нямецкай мовы, якую немцы ўгналі ў лютым 1942-га. Працавала яна ў зборачным цэху завода, але мела права, як і ўсе астарбайтары, часам свабодна выходзіць у горад. А значыць, валодаючы нямецкай мовай, магла паспрабаваць знайсці якіясьці явачныя кватэры.

М.Савіцкі: "Мы вырашылі, што надзейней за ўсё стварыць "сям'ю": "бацькам" маім будзе Карнілаў, "маці" — Аляксандрава. Сфабрыкаваў я даведкі, што мы — "сям'я Кузняцовых", родам з Оршы, і "засведчыў" іх уласнаручна зробленай пячаткай. Паводле легенды, мы працавалі пад Кёльнам у памешчыка-баўэра. Але пасля налёту англійскай авіяцыі на горад і ягонае наваколле вымушаны былі ратавацца ад "дывановых" бамбёжак. Была на ўсялякі выпадак у нас у запасе і іншая легенда. Ведаючы, што лагер савецкіх грамадзянскіх асоб, вывезеных у Германію, згарэў у Кёльне разам з усімі дакументамі, мы ў час праверак прадстаўляліся былымі рабочымі гэтага працоўнага лагера. Абедзве легенды спрацоўвалі ў залежнасці ад абставін".

...Абставіны пакуль былі на баку ўцекачоў. На шостыя суткі прайшлі прыкладна 240 кіламетраў і дабраліся да Ніжняй Саксоніі — гарадка Хільдэсхайм. Пасля адпаведнай паліцэйскай праверкі ўладкаваліся на невялікую фабрыку бакалейнага абсталявання ў якасці рабочых-інструменталышчыкаў. Аднак немцы былі звышпільнымі: кожны пабег вязня заўсёды рупліва расследаваўся і, як правіла, на тэрыторыі Германіі завяршаўся арыштам. Словам, летам 1944 года давялося зноў хавацца. Але ўжо ўдваіх — паколькі Марыя ў час начных перасоўванняў дзесьці згубілася. Па прапанове Карнілава вырашылі яшчэ раз паспытаць шчасця — пакінуць праклятую Германію і бегчы праз Бельгію ў Францыю. Прабіраліся пешшу па начах. Дайшлі да бельгійскага горада Льежа, але чымсьці прыцягнулі ўвагу патруля.

М.Савіцкі: "Нас схапілі і да канчатковага высвятлення "падазроных асоб" кінулі ў вільготны і смярдзючы падвал, дзе, як я прыкмеціў яшчэ з вуліцы, вокны былі закладзены цэглай. Мы зразумелі, што выратаваць нас можа толькі пабег. Уначы, пазрываўшы да крыві пазногці, разабралі цэглу і праз вакно пабеглі па незнаёмых вулачках. Ачунялі ў нішы нейкага старога пад'езда. Потым выбраліся з гэтага гарадка. Але мы ведалі, што паднятая трывога, і схавацца нам няма куды. Павярнулі на ўсход, каб зноў прабрацца ў Хільдэсхайм, спадзеючыся, што ў гэтым напрамку патрулі не такія ўжо пільныя. Да горада дабраліся паспяхова і вырашылі апраўдаць сваю адсутнасць на фабрыцы бакалейнага абсталявання тым, што, маўляў, ездзілі да знаёмых па той бок Рэйна, а на зваротным шляху патрапілі пад бамбёжку і ў мітусні згубілі маю "маці".

Якія мы былі наіўныя! Гестапаўцы на фабрыцы нас ужо чакалі. Дасюль не разумею, як яны маглі прадбачыць нашы дзеянні? Прывезлі ў дзюсельдорфскую турму. Надзелі "бранзалеты" і — напрамкі ў камеру смяртнікаў. Мы з Карнілавым падрыхтаваліся да горшага. Але нечакана ў суправаджэнні некалькіх канваіраў нас і яшчэ пяцярых вязняў вывелі з турмы, запхнулі ў крытыя грузавікі і ў суправаджэнні аўтаматчыкаў пераправілі ў канцэнтрацыйны лагер пад назвай Бухенвальд, хаця, па праўдзе кажучы, мы пра той лагер тады і не падазравалі..."

АД БУХЕНВАЛЬДА ДА "КРЫВІНАК"

...Вязні працавалі на Густслаўскім заводзе па вытворчасці зброі, які знаходзіўся ў двух кіламетрах ад Бухенвальда. Мала хто з іх выжыў. Агулам праз лагер прайшло каля чвэрці мільёна чалавек з усіх еўрапейскіх краін. Савіцкі, які па-ранейшаму заставаўся Міхаілам Кузняцовым, знаходзіўся ў Бухенвальдзе пад "чырвоным вінкелем" з літарай R, што азначала — палітычны вязень, па нацыянальнасці — рускі (беларусы і украінцы таксама прылічваліся да "рускіх"). Гэтыя страшныя аксесуары паказаны Савіцкім у аўтабіяграфічным партрэце "Вязень №32815" з серыі "Лічбы на сэрцы". У лагеры панавала масавая смяротнасць ад голаду, холаду, эпідэмій, знясільвальнай працы, здзекаў. Для выяўлення і знішчэння знямоглых праводзілася "фільтрацыя". Расправы над вязнямі суправаджаліся экзекуцыямі і насілі садысцкі характар: спальванне або закопванне жывых людзей, цкаванне іх сабакамі і г.д. Апісваць словамі ўсё гэта немагчыма...

М.Савіцкі. Мадонна Біркенау. З цыкла "Лічбы на сэрцы".

А потым быў канцэнтрацыйны лагер Дора, або Дора-Мітэльбау, размешчаны ў Цюрынгіі на поўначы Германіі. Тут звышсакрэтна пад зямлёй выраблялі лятаючыя снарады V-2 — "зброю помсты — 2", якую немцы выкарыстоўвалі супраць Англіі. Менавіта сюды 10 лютага 1944 года накіравалі з Бухенвальда Савіцкага і яшчэ 60 вязняў. Усіх шчыльна зацісналі ў вялізны грузавік, прымусіўшы сядзець на кукішках. Ахоўвалі чатыры эсэсаўцы з аўтаматамі. Прыбыўшы ў лагер, зняволеныя суткі правялі на марозе, у снезе, без ежы: за гэты час усіх фармальна зарэгістравалі. А да іх на гэтай фабрыцы смерці ўжо пакутавалі больш за 30 вязняў-рабоў...

Быў яшчэ адзін страшны канцлагер для савецкіх ваеннапалонных на поўдзень ад горада Гота, які таксама "прымерыў" на сябе Савіцкі. Гэта — "Крывінкі". Там вязні будавалі бункеры, капалі тунэлі і шахты. Пасля смерці Міхаіла Андрэевіча я спрабаваў адшукаць дакументальныя сведчанні пра гэтыя самыя "Крывінкі", але такой назвы нідзе не знайшоў. Магчыма, так яго называлі толькі вязні. А пры жыцці мастака я так і не сабраўся ў яго ўдакладніць. Мяркую, што ён меў на ўвазе лагер смерці блізу Ордруфа — таксама як адно з падраздзяленняў Бухенвальда.

Захавалася пісьмо былога вязня канцлагераў "Крывінкі" і Дахау Аляксандра Пацука, дасланае з Харкава свайму таварышу па пакутах Міхаілу Савіцкаму ад 7 студзеня 1973 года. Ліст трапіў у Саюз мастакоў, дзе я тады працаваў. Я адразу паімчаў да Міхаіла Андрэевіча на вуліцу Пераможную, дзе ён жыў, адшукаў дом № 17, кватэру № 71 і ўручыў адрасату вестку "з мінулага" літаральна на парозе.

У лісце, як я пазней даведаўся, аўтар з горыччу ўспамінаў пра тыя жахі, якія яны, зняволеныя "дахадзягі", паспыталі ў гэтых лагерах смерці. Памятаю, Савіцкі доўга чытаў пісьмо, узіраючыся ў кожны радок, потым нервова скамечыў недапаленую цыгарку і, не прамовіўшы ні слова, з гэтым лістом пайшоў у другі пакой...

ПЯКЕЛЬНЫ ТРОН САТАНЫ

Апошні канцлагер, які прайшоў Савіцкі, быў Дахау, непадалёк ад Мюнхена. Са сваімі шматлікімі філіяламі ён прызначаўся для фізічнай расправы з найбольш небяспечнымі, з пункту гледжання фашыстаў, "злачынцамі" — у асноўным савецкімі ваеннапалоннымі, а таксама партызанамі, падпольшчыкамі і антыфашыстамі акупаваных еўрапейскіх краін. Рэжым у лагеры быў такім, што сярэдняя працягласць жыцця зняволенага складала не больш за тры месяцы. Гэта дало права епіскапу Мюнхена Ёгану Нейхаўзлеру — былому вязню Дахау — сцвярджаць: "Тут сатана ўзвёў свой пякельны трон".

М.Савіцкі. Праклён. З цыкла "Лічбы на сэрцы".

М.Савіцкі: "Але, што дзіўна, я ніколі не верыў, што памру. Не верыў, што фашысты перамогуць, усімі фібрамі душы супраціўляўся смерці. Нават калі прывезлі ў Дахау на знішчэнне, калі выцягнулі з вагона-карцара мой шкілет і кінулі тут, ля платформы, — я верыў. Памятаю, знайшоў у сабе сілы агледзець сябе — шкілет шкілетам. Што тут казаць, ехалі ж тры тыдні пад адкрытым небам, на бляшанай падлозе, без ежы, а на двары красавік, холад сабачы... Я ляжаў, а міма эсэсаўцы сноўдаюць, такіх, як я, дахадзяг прыстрэльваюць. Да мяне чарга дайшла — думаю, няўжо і мой канец? Але ўмяшаліся нейкія салдаты: што вы нагрувашчваеце тут трупы? Нам няма калі іх прыбіраць — вязіце, маўляў, адразу проста ў печ!

Закінулі нас на двухколку адзін на аднаго, як дровы, — і ў лагер. Скінулі на зямлю каля тыфознага трыццатага барака-лазарэта. Пазней даведаўся: гэта быў асобы барак, колькі існаваў Дахау — з яго выходзілі толькі праз трубы крэматорыя... "Arbeit macht frei" ("Праца робіць чалавека свабодным") — такі здзеклівы надпіс быў адчаканены на рашэтчатых варотах лагера. Падумаў, правільней было б яго замяніць цытатай з Дантэ, кімсьці напісанай крэйдай на 25-м каранцінным блоку: "Lasst alle Hoffnung fahren, die ihr hier eintretet" ("Пакінь спадзевы ўсякі, хто сюды ўваходзіць")..."

АЛЕ Ж — ВЫЖЫЎ!

29 красавіка Савіцкі ачомаўся ад шуму, ад страшэннага крыку, змяшанага з нечалавечым болем і адначасова з дзікай радасцю. З цяжкасцю расплюшчыў вочы. У вялізным бараку, дзе ва ўсю яго даўжыню ў чатыры шэрагі ляжалі стогнучыя і трызнячыя шкілеты, з'явіліся людзі ў незнаёмай форме. Гэта былі салдаты-пехацінцы 45-й дывізіі 7-й арміі ЗША.

А Міхаіл, лежачы ў цяжкім забыцці, не мог спачатку зразумець, што ж адбылося. А калі зразумеў, дык жахнуўся: як ён вытрымаў столькі дзён без ежы і амаль без вады? Чаму не памёр, як большасць ягоных таварышаў? Шмат было "чаму". Але ж — выжыў!

Вось такім запомніўся Савіцкаму дзень вызвалення. Увечары ў Дахау прыбылі дадатковыя амерыканскія часткі для аказання першай медыцынскай дапамогі вызваленым, а 2 мая з'явіўся эвакуацыйны шпіталь ЗША. У тым шпіталі Савіцкі яшчэ доўга не мог хадзіць, толькі поўзаў на карачках. Аднак малады арганізм урэшце пайшоў на папраўку.

Праз некалькі дзён у Дахау прыляцелі савецкія афіцэры спецатрада СМЕРША з мэтай ізаляваць савецкіх грамадзян ад іншых вязняў, што стала першым крокам падрыхтоўкі іх да рэпатрыяцыі. Пасля допытаў і скрупулёзнай праверкі ў камендатуры СМЕРША, там жа, у Германіі, Савіцкага прызналі "добранадзейным". Такія "фільтрацыі" праходзілі ўсе савецкія ваеннапалонныя.

Як годнага да воінскай службы, у пачатку чэрвеня 1945-га Міхаіла накіравалі ў 288-ы гвардзейскі зенітна-артылерыйскі полк 6-й гвардзейскай механізаванай дывізіі, якая дыслацыравалася ў Венгрыі. Па загадзе начальніка штаба дывізіі Васілія Карэцкага радавога Савіцкага прызначылі ваенным мастаком па афармленні інтэр'ераў дамоў афіцэраў і салдацкіх клубаў. Яго дзіцячая мара — стаць мастаком — пачынала збывацца хаця б такім чынам...

У пачатку снежня 1946 года надышоў час мабілізавацца. І ўжо праз восем месяцаў 25-гадовы Міхаіл падаў дакументы ў мастацкае вучылішча, якое толькі што адкрылася ў Мінску...

Барыс КРЭПАК

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Новы выставачны корпус К. Маркса, 24

У сувязі з рээкспазіцыяй выставачны корпус будзе недаступны для наведвання *да 3 сакавіка 2022 года.*

Сувенірная крама на першым паверсе працуе ў звычайным рэжыме (уваход як з вул. К.Маркса, так і вул. Леніна, 20).

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 397 01 63
(экскурсійнае бюро)

Пастаянныя экспазіцыі:

■ Старажытнабеларускае мастацтва;
■ Мастацтва Беларусі XIX ст.;
■ Мастацтва Беларусі XX ст.;
■ Рускае мастацтва XVIII–XX стст.;
■ Мастацтва Еўропы XVI–XX стст.;
■ Мастацтва краін Усходу XIV–XX стст.;
■ 50 шэдэўраў.

Выставы:

■ Віртуальная выстава **"У майстэрні не вярнуліся… Аркадзь Астаповіч (1896–1941)"** да 125-годдзя з дня нараджэння мастака.
■ Зборная інтэрактыўная праграма **"Усё самае цікавае пра фарфор"** (7+). 20 лютага а 12-й гадзіне. Зарэгістравацца можна па тэлефонах: + 375 17 397 01 63; +375 25 667 78 19 (толькі званкі).
■ Лекторый выхадного дня. **"Там пачынаўся час: культура і мастацтва старажытнага Шумера"**. Чытае Валерыя Дубоўская, гісторык, навуковы супрацоўнік НММ Рэспублікі Беларусь (лекцыя чытаецца на беларускай мове). 20 лютага а 14-й гадзіне.
■ Выставачны праект **"Час цыклонаў"**. Жывапіс і графіка Галіны Нячаевай да юбілею аўтара. Да 29 лютага.
■ Выстава **"Кола жыцця"**. Абрусы Вольгі Паўленка. З прыватнага збору Марыі і Мікалая Ісаёнкаў. Да 8 сакавіка.
■ Выстава **"Акім Шаўчэнка (1902 – 1980). Жывапіс"**, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Акіма Міхайлавіча Шаўчэнкі. Да 13 сакавіка.
■ Выстава **"Памяць народа. Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прымеркаваная да Года гістарычнай памяці. Да 17 красавіка.
■ Сумесны выставачны праект Настацкага музея Рэспублікі Беларусь, Музея гісторыі горада Мінска і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **"Міхаіл Савіцкі. Да 100-годдзя з дня нараджэння"**. Да 18 красавіка.
■ Тэматычная экскурсія **"Самыя-самыя..."** (6+).
■ Тэматычная экскурсія **"Міфы старажытнай Грэцыі і Рыма"** (10+).
■ Аўтарская экскурсія **"Мінск у музеі"** (16+).
■ Экскурсія **"Жаночы партрэт"** (16+).
■ Дзіцячая тэматычная экскурсія **"Віды і жанры ў выяўленчым мастацтве"** (6 – 10 гадоў).
■ Дзіцячая тэматычная экскурсія **"Казкі Усходу"** (10+).
■ Інтэрактыўная экскурсія **"Як уладкаваны музей"** (6 – 10 гадоў).
■ Інтэрактыўная экскурсія **"Маленькі эксперт"** (6 – 10 гадоў).
■ Інтэрактыўная экскурсія **"Гульня ў нацюрморт"** (8 – 11 гадоў).

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 358 88 78

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII – сяр. XIX стст."**.
■ **Культура і мастацтва першай паловы XIX ст."**
■ Выстава Станіслава Жукоўскага **"Сядзібны свет мінулай эпохі"**. Жывапісныя работы з фондаў НММ Рэспублікі Беларусь. Да 19 сакавіка.
■ Спектакль тэатра ценяў **"Сядзібны прывід"**. Па папярэднім запісе кожную суботу а 12-й і 16-й гадзінах. Для арганізаваных груп кожную гадзіну штодзённа.
■ Квэст-гульня **"Таямніцы старажытнай сядзібы"**.
■ Сюжэтна-гульнявая праграма **"Метамарфозы ў сядзібным доме"**. Удзельнікі пазнаёмяцца з традыцыямі маскарадных паказаў XVIII стагоддзя і – з дапамогай інтэрактыву – з экспанатамі музейнай калекцыі.
■ Сюжэтна-гульнявая праграма **"Мова веера"**. Удзельнікі пазнаёмяцца з культурай веера розных часоў і народаў, навучацца мове веерных знакаў і мастацтву зносін.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ **Пастаянная экспазіцыя**.
■ Выстава **"Лямцавая рапсодыя"** Алены Панас. Да 28 сакавіка.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл. 8 (0222) 65 07 57, 65 88 00

Пастаянная экспазіцыя:

■ **"Мастацтва В.К. Бялыніцкага-Бірулі першай паловы XX стагоддзя"**.
■ Выстава жывапісу Аксаны Еўдакіменка "У пошуках зоркі". Да 20 лютага.
я

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Некрасава, 3.
Тэл.: 399-09-78
Час працы: серада-нядзеля з 12:00 да 20:00

■ Выстава **"Майстэрні часу: Міхаіл Савіцкі і яго вучні"**, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Міхаіла Савіцкага. Да 2 красавіка.
■ Праект Таццяны Савік **"Дэканструкцыя"**, рэалізаваны ў межах праграмы НЦСМ па падтрымцы маладых мастакоў White Room. Да 3 красавіка.

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47.
Тэл.: 242-78-14

■ Выставачны праект канкрэтна-канструктыўнага мастацтва **Constructio**. Да 20 лютага.
■ Выстава **"Успамінаючы Алену"**. Да 20 лютага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66.
Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля – з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер – з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30), панядзелак – выхадны.

■ **Пастаянная экспазіцыя**.
■ Выстаўка **"Ніколі больш"**, прымеркаваная да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту і 77-годдзя вызвалення вязняў нацысцкага лагера Аўшвіц-Асвенцім. Да 28 лютага.
■ Выстаўка **"Сімвалы блакаднага Ленінграда"**, прысвечаная 78-й гадавіне зняцця блакады Ленінграда. Да 9 сакавіка.
■ Выстаўка **"Лічбы на сэрцы"**, прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння М.А. Савіцкага. Экспазіцыя створана пры садзейнічанні Музея гісторыі горада Мінска, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў. Да 19 красавіка.
■ Музейна-педагагічны занятак **"Музычная культура ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны"**, заснаваны на рэдкіх матэрыялах з фондавай калекцыі музея. Дадзены занятак – спроба паглядзець на гістарычныя падзеі праз прызму мастацтва.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА "НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці: г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1.

■ Выстава работ Вольгі Южык **"Іншымі вачамі"**. Па 28 лютага.

Палацавы ансамбль:

■ Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Выставачны праект Максіма Петруля **"deКанструкцыя"**. Да 3 ліпеня. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Выставачны праект **"Добрыя весткі. Паштовая карэспандэнцыя XX ст."** Па 28 лютага.
■ Гульня-экскурсія **"Паштовы пазл"**. Па папярэдніх заяўках. Да 28 лютага.
■ Выстава работ Анастасіі Фяцісавай **"Стары Брэст – Нясвіж"**. Да 14 сакавіка.
■ Перасоўная літаратурная выстава **"Дзяды: гісторыя душы"** з Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Да 28 сакавіка.

Ратуша:

Пастаянная экспазіцыя:

■ **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы XVIII – 1-й палове XIX стст."**
■ **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі падзеі"**.
■ Калекцыя гадзіннікаў XIX – XX стст **"Культура часу"**.
З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы:

■ Экскурсія з элементамі гістарычнай гульні **"Музейныя вандроўкі"**.
■ Квэст **"Карта сямі каралеўстваў"**.
■ **"Дзень нараджэння ў Ратушы"**. Група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў.
■ **"Дзень нараджэння з Карамелькай (Лол Пчолкай)"**. Група ад 4 да 10 чалавек ад 4 да 12 гадоў.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8-01596) 2 82 90, (8-01596) 2 82 70.

■ **Пастаянная экспазіцыя**.
■ **Бясплатнае наведванне музея**. 23 лютага.
■ Квэст **"Белы слон"**. 26 лютага. Пачатак у 15.30.
■ **"Тыдзень роднай мовы"**: экскурсіі на беларускай мове па асноўнай экспазіцыі са зніжкай 25%, прэзентацыя музейных выданняў на беларускай мове. Да 27 лютага.
■ Выстава **"Белая зброя краін свету"**. 1-ы адсек Паўночнага корпуса Мірскага замка. Да 19 чэрвеня.
■ Віртуальныя экскурсіі па выставам: **"Аб'ядноўваючы прастору і час: беларуская землі на картах XVI – XVIII стст."**;
"На адным полі ваяры".
■ **Аглядныя і тэматычныя экскурсіі**.
■ **Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых**.
■ Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"** (група ад 2 да 5 чалавек).
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"**. **Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."**
"Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."
"Печы з каробкавай кафлі XVI – XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"
■ **Аглядныя і тэматычныя экскурсіі**.
■ **Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

■ **19 — "Шчаўкунок"** (балет у 2-х дзеях) П. Чайкоўскага (6+). Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 19.00.
■ **19 — Канцэрт "Музычныя легенды старажытнага замка"**(12+). Пачатак у 19.30.
■ **20 — "Фаўст"** (опера ў 3-х дзеях) Ш. Гуно (12+). У партыі Валянціна — Уладзіслаў Сулімскі (Марыінскі тэатр). Дырыжор — Уладзімір Авадок. Пачатак у 18.00.
■ **22 — "Дзікае паляванне караля Стаха"** (опера ў 2-х дзеях) У. Солтана (12+). Год гістарычнай памяці. ПРЭМ'ЕРА. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 19.00.
■ **23 — "Рамэо і Джульета"** (балет у 3-х дзеях) С. Пракоф'ева (12+). Дырыжор — Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.
■ **24 — "Травіята"** (опера ў 4-х дзеях) Д. Вердзі (16+). Дырыжор — Алег Лясун. Пачатак у 19.00.
■ **25 — "Бахчысарайскі фантан"** (балет у 2-х дзеях) Б. Асаф'ева (12+). Дырыжор — Мікалай Калядка. Пачатак у 19.00.
■ **25 —** Канцэрт **"Іспанскае капрычыа"** (12+). Пачатак у 19.30

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

■ **19 — "Калабок"** Д. Зімніцкай (казка-гульня на 1 дзею) (3+). Спектакль у фае тэатра. Пачатак у 11.00.
■ **20 — "Аладзін"** Н. Гернет (6+). Спектакль у зале тэатра. Пачатак у 11.00.

12 і 13 лютага ў Музычны тэатр вярнуўся адноўлены мюзікл "Бураціна" Аляксея Рыбнікава, што быў сцэнічна ажыццёўлены Настассяй Грыненка ў 2003-м і за гэты час ніколькі не страціў пастаноўчай актуальнасці. А некалькі тыдняў таму тут з'явілася абсалютная прэм'ера — вадэвіль "L'amour, l'amour — каханне, каханне", і гэты спектакль трупа паспела звазіць на гастролі не толькі па Беларусі, але і ў расійскую Тулу. Дык што ж там такога "каханенькага-родненькага"?

Надзея БУНЦЭВІЧ / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Падвойны бенефіс кахання на траіх

Падзел на дзве часткі самой назвы "L'amour, l'amour — каханне, каханне" цалкам адпавядае зместу новага спектакля. Бо ён складаецца з дзвюх асобных гісторый-навел — французскай і рускай, звязаных між самой не сюжэтна, а тэматычна: у цэнтры кожнай апынаецца звыкла-нязвыклы любоўны трохкутнік, складзены з брутальна просталінейнага мужа, капрызлівай хітрай жонкі і яе манернага палюбоўніка-нарцыса. Іграе іх адзін і той жа зладжаны тэрцэт артыстаў: у адпаведнасці з названымі ролямі — Аляксандр Асіпец, Ілона Казакевіч, Дзяніс Нямцоў. Атрымліваецца своеасаблівы "бенефіс на траіх", што патрабуе ад удзельнікаў максімальнай аддачы.

Жанр вадэвілю, пазначаны ў афішах і праграмках, адпавядае спектаклю хіба часткова — з пункту гледжання агульнай канвы і настрою. Французская дзея суправаджаецца танцамі, што супадае з нацыянальным менталітэтам герояў (не будзем забываць, што не толькі з часоў Людовіка XIV, але і значна раней Францыя займела славу "танцуючай нацыі" і што ніводная французская опера, пачынаючы з эпохі барока, не абыходзілася без харэаграфічнага складніка). Расійская дзея аздоблена старадаўнімі рускімі рамансамі, сярод якіх пераважаюць цыганскія. Поўная адсутнасць у першым акце спеваў крыху бянтэжыць заўсёднікаў, бо тыя ходзяць у Музычны тэатр найперш па музычнае разгортванне падзей. Але другая дзея з яе тонкасцямі рамансавай лірыкі бярэ рэванш. Больш дакладным азначэннем жанру становіцца "вечны анекдот у дзвюх частках", як па ходу дзеяння называюць спектакль самі яго ўдзельнікі.

Літаратурнай асновай (і найперш другой дзеі спектакля) стала мініяцюра-фарс Аляксея Курбскага "У дамскай блізне", надрукаваная ў Санкт-Пецярбургу ў 1914 годзе. Тэкст уяўляе з сябе звыклую, невялічкую па аб'ёме камедыю, куды цягам пастаноўкі былі дададзены "ўстаўныя", у поўным сэнсе слова, музычныя нумары. Прызнацца, у падобных спектаклях, дзе на першы план выходзяць не спевы, а менавіта акцёрская іграа і вынаходлівасць, артысты Музычнага тэатра часам бываюць разгублены: усё ж звычайна іх намаганні скіраваны крыху ў іншы бок. Знаны расійскі рэжысёр Мадэст Абрамаў зрабіў усё, каб давесці зваротнае. І сапраўды, цягам усяго спектакля (дарэчы, даволі працяглага па сучасных мерках) ні на імгненне не ўзнікае адчування няёмкасці за артыстаў — толькі захапленне феерверкам іх бліскучай акцёрскай іграы. Бо словы не проста прагаворваюцца, а напаўняюцца ўнутраным сэнсам, абыгрываюцца візуальна, літаральна ў кожную фразу прыўносіцца нейкая схаваная дзея, што надае словам камічнае пераасэнсаванне і пры ўсёй зададзенасці сітуацый скарае свежасцю і задорам. Да таго ж адным маленькім штрыхом рэжысёр перайначвае фінал, і героі, з якімі, здавалася б, усё даўно ясна і зразумела, раптам атрымліваюць "другое дно", куды большую аб'ёмнасць і неадназначнасць характараў. Сачыць за ўсім гэтым — сапраўднае задавальненне. Атрымаўшы яго, раптам разумееш, што словам "любоў" назва спектакля акрэслівае яшчэ і пачуцці гледачоў да артыстаў: кожны з траіх "бенефіцыянтаў" становіцца ўлюбёнцам публікі. А рэжысёр пры такім раскладзе, бы той "трэці залішні", сціпла сыходзіць у цень, папярэдне зладзіўшы з махровай трывіяльшчыны сваё маленькае чараўніцтва.

К

Увага! Аб'ява!

Газета "Культура" на конкурснай аснове запрашае на працу:
— журналістаў;
— адказнага сакратара з досведам работы ў праграме Adobe InDesign.
Тэлефон для даведак +375 17 286 07 97

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Даніїл ШЭЙКА, Змітер ЮРКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Мерканні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2022. Наклад 2991. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 18.02.2022 у 19.00. Замова №431.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").